Natknęłam się na forum „Bohaterowie czy kolaboranci", gdzie – na podstawie prac Turonka i Józefa Mackiewicza – mówiono o współpracy z Niemcami partyzantek, zaangażowanych w zwalczanie stalinowskiej partyzantki, organizowanej przez NKWD, ale nie tylko tej. Raczej się o tym nie mówi, ale historyczne materiały są. Nowe granice, wytyczone palcami wodzów, autorytarny stalinowski klimat na Białorusi, nasz ojczyźniany (ślepy) powrót do przedwojnia w mentalności, to wszystko uniemożliwia rzetelne zbadanie mozaiki partyzanckiej czasów tej strasznej wojny. Była bardzo rozległa ta wojna. Poskładać tej mozaiki nie da się szybko, albo w ogóle się nie da. Oficer specjalny Herbert „Tom" Jung Brygady Świękrzyskiej, współpracujący z nazistami, tropił i katował członków AK. Poskrobię tylko w tych partyzantkach, a już umysł zalewa się krwią niewinnych ofiar. Mam wrażenie, że każda partia, ba, nawet partyjka, organizowała sobie partyzantkę, aby mordować się z powodu światopoglądów politycznych!

W AK byli Romowie, o czym przypomina dr E. Wilczur. Dzielnie walczyli, choć gęsto ginęli, tropieni przez nazistów i kolaborantów, przeznaczeni do całkowitej zagłady, jak Żydzi. Mało kto o nich dzisiaj wspomni.

Wrócę na chwilę do BRL, tematu, który porusza Łarysa Geniusz. Głową BRL na uchodźstwie dzisiaj jest Iwonka Surwiłła, mieszkająca w USA, a zatem BRL trwa w postaci szczątkowej. Śmieszne to? Lista prezydentów BRL na uchodźstwie jest dostępna w Internecie. Od 1920 roku BRL rezydowała w Pradze. W 1919 roku Anton Łuckiewicz i Ignacy Paderewski ogłosili w Paryżu porządek budowy federacji dwóch państw, Polski i Białorusi. Niestety, szowinistyczni nacjonaliści z jednej i drugiej strony nie dopuścili do tego. Zaczęły się targi o terytoria i narodowe bla-bla. Ostatecznie oba państwa wkrótce wyszły na tych targach nacjonalistów szowinistów jak Zabłocki na mydle, jedno bez ziem po nowym strasznym wojennym rozbiorze (którego fatalne kulturowe skutki trwają do dziś, jak też trwa do dziś sam rozbiór), a drugie bez tożsamości, wchłonięte przez Stalina, wyniszczone z inteligencji. Na federację było odrobinę za późno, bo BRL od kilku miesięcy już była wchłaniana przez Rosję, no i została ubezwłasnowolniona jako sajuznaja respublika, a to za sprawą białoruskich komunistów, choć mimo wszystko jeszcze można było to odkręcić. Jaka szkoda! Jaka zdrada! Zbudowalibyśmy obywatelską federację, gdyby nie ci szowiniści obu stron, nie ta komunistyczna zdrada. Zbudowalibyśmy raj? Z jednej strony RP pod Orłem, a z drugiej Białoruś pod Pogonią?

Znowu mówię: – Męska historia jest straszna, a do tego głupia, krótkowzroczna. Jest to historia bardzo złych mężczyzn. Antoni: – Już przestań walić w mężczyzn. Ja: – Pomyśl przez chwilę, jak ja. Jest to historia bardzo złych mężczyzn i znikomej liczby usłużnych kobiet. Antoni: – Rzeczywiście. Wyobraziłem sobie, że to, co robili mężczyźni, robiły kobiety, usuwając mężczyzn ze wszystkich dziedzin, ze szkół, nauki, historii. I zrobiło mi się strasznie! Rozjaśniło mi się, w czym rzecz. Żeńska megalomania narodowa, żeńskie rzezie, krew, głupota, pieniactwo, znowu rzezie, i wojny, wojny, pacyfikacje wiosek, palenie żywcem niemowląt, strzał w tył głowy, dymiące piece krematorium, czystki etniczne, rasizm, szowinizm, nazizm, szowinistyczny nacjonalizm, rozbiory, znowu wojna i od początku. Czystki etniczne, rzezie… Ja: – Czułbyś pogardę do kobiet, znienawidziłbyś je? Jeśli na dodatek systematycznie gwałciłyby mężczyzn kolbami karabinów i kijami, i pozostawiałyby, aż się wykrwawią? Antoni: – Tak. Przy takim odwróceniu już to czuję, nienawiść i pogardę. Ja: – Widzisz? Wystarczy wyobrazić sobie kuriozum: to wszystko było i jest dziełem samych kobiet i znikomej liczby mężczyzn, dopuszczonych do pomagania złu, czynionemu przez złe kobiety, a natychmiast widzisz, że historię tworzy bardzo zły mężczyzna i jego nieliczne pomocniczki, tak samo złe, i jeszcze gorsze, bo muszą się „sprawdzić". To te kobiety są ośmielane. Dlaczego w dalszym ciągu mamy na to pozwalać? Ten zły mężczyzna nadal chce czcić innego złego mężczyznę, no i wyciąga ze sterty niewinnych ofiar jakiegoś bandytę Rajsa jako bohatera narodowego!!! Antoni: – Odkrywam poetkę niemiecką Christę Reinig. Miała zakaz druku w DDR. Zacytuję ci, tłumacząc, zapisuj, będzie ci pasowało. To o kobiecie:

*Z tego świata*
*nie należy do nas nawet kurz*
*Kiedy umrzemy chowa się nas*
*W ziemię naszych wrogów.*

Ja: – Toż to moje klimaty! Mówimy, jak się czujemy w złej historii, a nas zakazują. Antoni: – To są mężczyźni przeszłości. Zapisz tę moją myśl. Ja: – Zapisałam. Antoni:

– Zapisz jeszcze jeden cytat z Christy, jest przejmujący i pasuje do twego szkicu:

*To co powiedział Lenin o Trockim*
*Hitler o Żydach*
*Freud o kobietach*
*Nie obchodzi mnie.*

O! – wołam. – O! Jak dobrze, że nie jestem samotna w moim myśleniu, że jest jeszcze Christa Reinig!

Antoni: – Bo mężczyzna rządzi światem, wymyśla ideologie, robi wojny, ale potem to wszystko porządkuje, odbudowuje. Jemu jest dobrze w jego własnej historii. On jest wojennym bohaterem. Nie zechce cię wysłuchać.

Ja: – Wiem.

U Łarysy Geniusz w „Ptakach bez gniazd" natknęłam się na określenie, dotyczące kobiet hitlerówek: „wydra partyjna". Tak! Taka „wydra partyjna" jako kapo w obozach zagłady przewyższała okrucieństwem mężczyzn. Opisywałam to, opierając się na relacji byłej więźniarki obozu, krewnej mego męża, wtedy studentki, a potem cenionej profesor weterynarii. „Wydry partyjne" nie myślały jak kobiety. Miały mentalność mężczyzny-psychopaty, ośmielonego przez psychopatę Hitlera. Psychopata, narkoman, sadysta – oto najwyższa ranga hitlerowca. I zbieranina podobnych z całego świata. Oto szczyt patriarchalizmu z kobietą, pozbawioną własnego głosu!

Jakie łatwiutkie zdanie mają pisarze: „wszystko już zostało powiedziane".

Jakie „wszystko"?

Powoli odtajniane dokumenty aż krzyczą, że nie wszystko. Wymiękam. Dosłownie widzę krew i przedśmiertny krzyk niewinnych ofiar.

Z szyderczym śmiechem odkrywam w dziedzinie polityki i dzisiaj coś takiego, jak „wydra partyjna". Jasne, że nie tak złowieszcza jak hitlerówa. Jednak to „wydra partyjna". Jak coś partyjnego powie! A jak się zaprze, żeby było tak, jak ona chce, ale to przecież nie ona chce. Chcą tak jej partyjni koledzy, partyjne wydrzaki można rzec. Do współczesnych narodowych socjalistów, nagle powstałych z grobu, dolepiają się rasowe współczesne żeńskie „wydry partyjne", stroją się na czarno. Gdyby nie te beznadziejne kobiety, rzeczywistość wyglądałaby lepiej, łagodniej, po ludzku. Niestety ciągle wydrzak znajduje swoją wydrę. I tak się kumają i kumają, źle służąc światu.

Piotr Zychowicz w głośnej, a moim zdaniem beznadziejnej, książce „Pakt Ribbentrop-Beck" omawia powyższe sprawy, ale tylko męskie rzecz jasna. Temat: Co by było, gdyby Polska wraz z Hitlerem napadła na Rosję. Autorze, autorze! Aleś szczyl! Toż to beznadziejne, taka fantazyjka! Zawsze tak jest, że na naszych oczach staje się to – „co by było, gdyby" i żadne inne „gdyby" zwyczajnie nigdy się nie staje. Staje wodzowi organ władzy i wódz stawia pytanie: co by było, gdyby napaść na tych, na tych i na Polskę? I napada. Stalin zadaje sobie pytanie: a co by było, gdyby tak zorganizować gułagi? I organizuje. Psychopaci u władzy wiecznie nam to robią – wprowadzają swoje patologiczne: a co by było, gdyby...

Pierwotne zamierzenia opisują prewencyjnie w swoich książczynach, odezwach, broszurach. Wódz stawia pytanie: a co by było, gdybyśmy rzeczywiście podzielili ludzi na nadludzi Niemców i podludzi Słowian i Żydów, a najpierw Żydów?

I tak zaczyna dzielić.

A jakie to uczucie – mordować rodaków, sąsiadów? Przyjemne?

W fantazji „co by było, gdyby" jedno mogłoby się sprawdzić, gdyby rzeczywiście polski Orzeł i białoruska Pogoń stworzyły w 1919 federację, nowoczesną, to jest obywatelską, nie byłoby Katynia ani Kuropat, ani NKWD nie dokonałoby totalnej rzezi na Białorusinach, a naziści utonęliby w bagnach. Łarysa Geniusz opowiada o tym, jak NKWD (kiedy już Armia Czerwona goniła nazistów) urządzało po całej Europie polowanie na Białorusinów, marzących o BRL, i wysyłało do łagrów. Nas zabito. Dosłownie: zabito. *Jaszczo żywiem* – cudem w resztkach. Czy dzisiaj możliwa byłaby federacja Orła i Pogoni? Może warto rozważyć sposób? Pół Polski tęskni za WKL i dusi się w ciasnych sztucznych granicach. Takie sprawy, jak więź pomiędzy narodami, powinny stawać się bez udziału szowinistów – całkowicie poza nimi. Czy możemy obejść się bez szowinistów? Moim zdaniem, tak. Ale czy choć raz bez nich się obeszło? Do tego potrzebne są osobowości, dobrzy ludzie, ludzie z klasą. Niech wreszcie scześnie ta stalinowska granica pomiędzy Polską a BR!

W książce Zychowicza coś przykuwa moją uwagę – termin Wasserpolen, co znaczy: „rozwodniony Polak", którego da się przerobić na Niemca. Tak przerobieni z „rozwodnionych" Polaków w „prawdziwych" Niemców mieli być u nazistów m.in. Ślązacy i Kaszubi.

Opowiadam o tym mężowi i mówię: Ty jesteś rozwodniony Polak. On: Nie! Ja: Nie pytano by cię, gdyby co. On: Nie! Ja: Byłbyś odgórnie z mocy rozkazu wodza przeznaczony do przerobienia na „prawdziwego Aryjczyka", gdyby co.

Mąż: Wassermensch. Musiałbym być Wassermensch, „rozwodnionym człowiekiem", jeślibym dał się przerobić.

To prawda. Najpierw trzeba być Wassermensch.

Ja: Mam mieszane pochodzenie, to jak tu bym pasowała, gdyby co? Chciałabym się ostać w tym stanie. Żaden ze mnie Wassermensch w wersji żeńskiej. Nigdy! O czym innym ci powiem, o czymś przyjemniejszym. Odkryłam białoruską piosenkę, zacytuje ci, i stanowczo wolę przedkładać nasze piosenki nad wszelkie patologiczne patriarchalne działania wodzów:

*Hop, hop, wasiloczki,*
*mai czarawiczki,*

*(C.d. ze str. 26)*

*(C.d. na str. 31)*

# Podlasie jest jedno

**fotoreportaż Ewy Zwierzyńskiej**



Wieś Panasiuki leży kilka kilometrów na wschód od granicy polsko-białoruskiej. Mieszkają tam cztery osoby, a ściślej mówiąc cztery staruszki. Pani na zdjęciu dobrze pamięta czasy, gdy wieś leżała w Polsce, zna podlaskie wioski. W naszej grupie odnalazła swego kuzyna. Rozdzieleni na co dzień granicą rozmawialiśmy w tym samym języku. Oprócz kota i ptaszków na drzewie nikt nie dotrzymuje jej towarzystwa. Śpiewaliśmy jej pieśni, a ona płakała



Biała Wieża w Kamieńcu to zabytkowa budowla z XIII wieku, nigdy nie zdobyta. Obecnie mieści się w niej muzeum. Od niej – jak się uważa – pochodzi nazwa Puszczy Białowieskiej.



Instytucja Ławeczki równie dobrze funkcjonuje na Podlasiu polskim jak i na Podlasiu Białoruskim



Zabytkowa, drewniana zabudowa uliczek Kamieńca Litewskiego przenosi nas w przedwojenny klimat małego miasteczka

Na Białoruskim Podlasiu zachowały się zwyczaje, które u nas już zaginęły, np. tradycja wypasu krów z całej wsi na wspólnym pastwisku. Przez cały dzień stada pilnują pasterze, którymi są po kolei wszyscy mieszkańcy wsi



Piękne, drewniane zdobienia okien to cecha charakterystyczna wsi podlaskich po obu stronach granicy



Na lokalnym targu w wiosce Beździeż znajdziemy towary, które są dostępne również u nas






Cmentarze z kamiennymi, pomalowanymi nagrobkami to cecha charakterystyczna podlaskich nekropolii




Zaułki Kamieńca Litewskiego



Nie tylko Chiny to kraj rowerów! Rowery na Białorusi są wszechobecne. Podobnie jak w małych wsiach i miasteczkach na polskim Podlasiu

*palubiła Wasilka,*
*choć jon niewialiczki*.
Mąż: „Choć jon niewialiczki". Jakie piękne słowa!
Nasze ludowe piosenki mają piękne słowa. Mój *niewialiczki* mąż został uwzględniony.
Larysa Geniusz w „Ptakach bez gniazd" zauważa, że przy ludowych białoruskich piosenkach, przy ich słowach, niejeden uznany poeta wypada blado. I ma rację. Przy naszej śpiewanej liturgii niejeden uznany zespół czy solistka wypadają blado – łomoczą do żeńskiego jęczenia. Mamy wysokie status quo w naszej kulturze i wszystko, co bledsze, choć reklamowane, nie ciągnie nas w dół tak łatwo.
Mam dość nie mojej historii, toteż mówię o piosence.
Mąż: Obcy to ci, którzy służą w armii psychopaty, zabijają, palą, kaleczą, odbierają domy i lubią to. To są obcy! A nie żadne pozaziemskie cywilizacje, jakieś zielone ludziki. Obcy to nie mniejszości!
Interesujący szkic o ludowych pieśniach białoruskich napisały dwie kobiety, Zinajda Możejko i Inna Nazina. Te pieśni jeszcze niedawno rozbrzmiewały zewsząd, z pól, z podwórek. Pamiętam to. Były to pieśni domowe – weselne, pogrzebowe, chrzcinne. Były to pieśni przekraczające domowy wymiar – pieśni furmana, przewoźników, epickie, rekrutów, miłosne, komiczne. Były to pieśni noworoczne, wiosenne, letnie, zimowe, jesienne. Większość z nich pochodziła z czasów starożytnych. Otrzymaliśmy je od Dregowiczów, Rodemiczów i Kriwiczów. Pieśni te wychodziły przy pomocy intonacji poza tradycyjną skalę, to stąd słyszało się je z daleka. Skala ulegała wzmocnieniu na końcach wersów. Jakby zrywała się do lotu lub pikowała ptakiem w dół. W tych pieśniach zawierała się potężna siła. Była to najważniejsza forma naszej ekspresji artystycznej. *Hop, hop, wasiloczki, mai czarawiczki, palubiła Wasilka, choć jon niewialiczki*...
Miłymi słowami *nikoho my nie abdużajam?*
Łarysa Geniusz w „Ptakach bez gniazd" specjalnie podkreśla jeszcze jedna naszą cechę, tę najbardziej podstawową: nie chcemy za dużo. *Zamahać za mnoho heta muka. Na szto czaławieku muczacca. Lepiaj mieć czas na adpaczynak. Lepiej rabić sztoś darecznaje i dobraje.* A więc: nie chcieć za dużo. Mieć cel, dobry, budujący. Cieszyć się tym, co się ma. Być gościnnym. Porządnie wykonywać pracę, nawet słabo płatną. Docenić zwykły dzień. Przekonać się, że drobne codzienne radości to bardzo, bardzo dużo. Szczerość i uczciwość w stosunkach międzyludzkich i rodzinnych. Brak nawet cienia maski, gry. Mówimy to, co myślimy, a myślimy to, co dobrze przemyśleliśmy. Piszemy tylko o tym, co przemyśleliśmy i poznaliśmy. Wierzymy, że słowo pisane nie może być kłamstwem, więc słowa kłamliwe wydają się nam krańcowo *ahidnyje* i ich autor to *ahida*. Nie tracimy tej wiary, uznając, że *ahidny* autor ze swymi *ahidnymi* słowami to wyjątek. Jednak ta cecha nas gubi i tak wiarę możemy utracić, zarówno do pisanych, jaki wypowiadanych. Jeśli ta nasza wiara nas zawodzi nie pierwszy raz, stajemy się podejrzliwi do wszystkich w naszym pobliżu. Przestajemy rozmawiać, czytać, słuchać. Co najwyżej powtarzamy w powietrze: *siahonnia niama dobrych ludziej. Usie parabilisa ahidnyje*. Tracimy wiarę w szczerość uśmiechu rozmówcy. Łarysa Geniusz świetnie przedstawiła tę naszą cechę szczerej uczciwości i otaczania nas przez tych, których zwiemy *ahidnymi*. Zawsze zagęszcza się wokół nas tłum nieprzychylnych nam osób. Dlatego z taką podstępną łatwością Rajs „Bury" mógł pozabijać niczego niepodejrzewających furmanów. W nas nie ma podstępności.
Paradoksem jest, że tych *ahidnych* najwięcej widzimy wśród swoich. To też podlega diagnozie w książce Łarysy Geniusz. Swoi bardzo chętnie wysługują się wrogom białoruskości. Takie wysługiwanie się rozwija podstępność osoby, obcą nam cechę. Podstępność ta jest oczywiście nieudolna i w końcu pogrąża osobę, kompromituje, niszczy, a przy tym przez tych naszych *ahidnych* powstaje wrażenie, że wszyscy jesteśmy tacy, że prześladujemy własną tożsamość.
Łarysa Geniusz wiele wycierpiała, walcząc o białoruskie państwo, o białoruskość. Przeszła gułag. Do końca życia pozostawała pod nadzorem służb specjalnych. Strzegła przed NKWD emigracyjnego archiwum BRL. Gdzie to archiwum jest obecnie? Nie mogę dociec.
Tyle lat walki, tyle męki, i to miałoby na nic? Teraz wielu z nas zapiera się pochodzenia, tak jak chciało NKWD: nie ma takiej narodowości, nie ma takiego języka, nie ma takiej kultury. Nie ma nas. Tak chcemy? Będziemy sobie wymyślać inną narodowość, podlaską czy tam jeszcze jaką? Tylko żeby wyrzec się słów: Białorusin, Białorusinka, białoruski?
Pośmiertny triumf NKWD jest aż nadto widoczny.
Powrócimy do „tutejszości" bez imienia? Pośmiertny triumf przedwojennych szowinistów byłby aż taki? Ach, Łaryso, po co było tyle Twojej męki!
Trzeba odwagi, aby pozostać przy białoruskości. O odwagę chodzi. O nic więcej.
Rozmach miał projekt ULB Giedroycia. Giedroyc potrafił jeszcze myśleć. W ciasnych sztucznych granicach RP nie potrafimy myśleć. Myśleć można wciąż tylko przez WKL. Bez rozmachu, mknącego w pamięć o WKL, bez ULB, kurczymy się do wartości gminnej, która nikogo na świecie nie obchodzi.
Polska realizuje projekt Giedroycia, ale też się na nim parzy, bo okazuje się, że na Ukrainie czczą jako bohaterów narodowych bandytów, którzy dokonywali czystek etnicznych na Polakach. To nic i to już za wiele. Chodziłoby o realizowanie projektu ULB jako projektu kulturowego z udziałem historyków i bez histerii narodowych. Tymczasem to przede wszystkim polscy i rosyjscy historycy wspólnie badają dzieje swych ojczyzn. I okazuje się, że nie było polskiej interwencji w Moskwie okresu *smuty*. Razem można wyjaśnić wiele nieporozumień, przeprosić za

krzywdy, odkryć wiele nieznanych dokumentów. Potrzeba ciągłego dialogu pamięci kulturowej. Z tego nie można rezygnować. A tu w ULB wdał się „sikorskizm", tak zwana „polityka piastowska". Toż to peerelowszczyzna! Toż to dotyczyło tak zwanych ziem odzyskanych! Mamy czas poszukiwania kolorowości, a tu wdziera się polityka ujednolicania. To się nie sprawdzi, ta „polityka piastowska". To ustawi Polskę w sytuacji peryferii, bo przecież mamy wchodzić do „głównego nurtu" i wszystko z niego przyjmować bez dyskusji. Toż to wytworzy ruchy odśrodkowe w regionach, które nadal pozostają jagiellońskie. Jak ktoś u nas coś wymyśli…

A oddanie kultury we władanie IV Rzeszy popkultury jest ostateczną zdradą własnej kultury.

**Tamara Bołdak-Janowska**

***Гумарэска***

## *З жыцця беластоцкіх хронікаў*

– ... Я, брат... за табою, хоць у пекла! Няма, няма ў свеце цяпер праўды ды справядлівасці, нідзе яе не знойдзеш! А сапраўднае мужчынскае братэрства – дзе яго шукаць!.. Хіба што толькі мы... Эх, браток, сябра мой найдаражэйшы! Хай цябе яшчэ раз пацалую! Я за цябе, брат, апошнюю кашулю аддам! І крыві не пашкадую! Хай знаюць, як Антося або Ваціка зачапляць! Хай каторы хоць кране! Ейбогу! – біўся ў свае грудзі Вацік Падбельскі і шчыра прыгортваў да сябе Антося Заморскага, а той кланіўся да яго больш ужо па інерцыі, але шчыра і з сяброўскім адданнем.

Адны яны сёння засталіся на пляцы бою. Во, якія ў іх моцныя галовы – усіх перапілі, і ні дождж ім нястрашны, ні спёка! Ну, можна і ў кватэры, Антосевай, пабаляваць, ад таго часу, як ягоная Адэльця вярнулася з сынам да бацькоў. Тая Адэльця такая бестыя была! Антосю ягоная кабета ўсю касу загадвала аддаваць, а потым мусіў прасіцца мужык пару грошаў на папіроску! А цярер то і „куранёўка" яму скончылася, не было б з чаго прасіць. А да працы ўжо не гоняць „блакітных птахаў", як калісьці, ды і працы тое няма. Дэмакратыя ў нас – хочаш, жыві, хочаш – не. А грош знайсціся мусіць, каб хоць за тую хату заплаціць, бо ж вываляць на брук цябе самога разам з манаткамі. Наняў тады вялікі пакой Антось тром студэнткам, сам у маленькім гнездзіцца, і хоць за хату заплаціць мае з чаго. У яго ў хаце прыбрана, не то, што зусім бабскай рукі не відна. А цяпер вось нядаўна парабіў пры разгрузцы тавару ў „прываціяжа" разам з „рускімі"...

Засталося ў Антося 20 злоты. Ёсць хата, ёсць „шкло"... Ды парожняе. І бабы няма. Не скажам усё ж, браткове, што ў Антося Заморскага з былых бунтарскіх маладых мараў пра збаўленне свету адно толькі засталося... Але тое шкло, чорт яго вазьмі, пустое! Шклянкі, чаркі, слоічкі з-пад гарчыцы, бутэлька пад сталом. Але ж „каса" яшчэ ёсць, тыя 20 новыя *зэтэлпэ*, за тую работу, што нарваўся быў на разгрузцы. Цэлыя 20 злоты ў адной паперцы!

– Ідзі, браток, чуеш, у краму, купі добрае віно, – працягнуў свой скарб Антось Ваціку.

– Ты што-о-о?! То ж у „рускіх" ведаш што і колькі за такія грошы можна набыць?!.

– Дазволім, брат, час правесці культурна. Мо нават якую пажондную паненку запросім...

Тут і паненка нарвалася – Гэлька з другой лесвічнай клеткі. Мо не такая пажондная, але пачцівая. Таксама апошнюю кашулю пакласці можа на алтар сяброўства.

– Гэлька мі сень падоба, ажэне сень з Гэльком, Гэлька сама така мала, леч ма... душэ вельком! – заспяваў Вацік уцешаны.

Гэлька ахвяравалася збегаць у краму па віно. Праз хвілін дваццаць прамчалася, а ў яе доўгіх кішэнях боўталіся два зялёныя бутлі.

– Што так доўга насілася? А дзе рэшта? – пацікавіўся Антось, паглядзеўшы на цану віна.

– Праўда, рэшты мне не выдала, аж 2 злоты! – спахапілася жанчына.

– Ну, вырву іх гадаўцы з горла! Навучыліся ашукоўваць у белы дзень! – зароў Антось і папёр у манапольку. А там напаў на прадаўшчыцу: – Адбурыла маю сяброўку! Аддавай два злоты! Віно купляла яна, дзве бутэлькі, толькі што! Разарву як жабу!..

– Ці-і-і-ха-а! Не палохай кліентаў! На два злоты і пайшоў прэч! – прасіпела злосная прадаўшчыца і сунула яму ў далонь манету.


Купіў Антось па дарозе дадому за тыя два злоты ў перакупшчыцы пад крамай разарваную пачку „рускіх" папіросаў і вярнуўся ў хату. Добрыя сябры не пачыналі частавацца без гаспадара.

– Во, наце, курыце. Вырваў заразе з горла тыя грошы, раз-два! А то навучыліся абдурваць прыстойных кліентаў! Не жарты – амаль даляр! А чаму ты тады так доўга таўклася, Гэльця, па тое віно? Я ж справіўся ў пяць хвілін. Мо чарга была?

– А што, ужо яе не было? За мною стаяла было чалавек з сорак у гарэлачна-вінным аддзеле спажывецкай крамы...

– То ты не ў манапольцы тое віно купляла?!!

**Міра Лукша**



# Календарыюм

## Чэрвень – гадоў таму

**985** – Каля 1028 г. нар. князь полацкі Усяслаў Брачыслававіч (памёр у 1101 г.), выдатны уладар, змагаўся за самастойнасьць і незалежнасьць Полацкага княства. У 1068 г. быў выбраны вялікім князем кіеўскім, праз год зрокся гэтага пасаду, вярнуўся ў Полацак, дзе пераможна адбіваў нашэсьці кіеўскіх і іншых князёў на Полаччыну.

**440** – У 1573 г. апрацаваны і прадстаўлены для зацьвярджэньня кандыдатам на трон Рэчы Паспалітай Генрыкам Валуа прывілеі для шляхты, паводле якіх між іншым яна свабодна выбірала караля.

**220** – 17.06.1793 г. у Гародні пачаўся Сойм, які зацьвердзіў другі падзел Рэчы Паспалітай ды прыняў другую, супрацьлеглую канстытуцыі ад 1791 г., кансэрватыўную канстытуцыю.

**150** – 3.06.1863 г. адбылася бітва паміж паўстанцамі і царскімі войскамі пад Мілавідамі каля Слоніма.

**150** – 26.06.1863 г. быў створаны ў Вільні Выканаўчы Аддзел Літвы (Літоўска-Беларускі чырвоны жонд), старшыня Якуб Гейштар, члены: Кастусь Каліноўскі і У. Малахоўскі. Гэта быў цэнтр па кіраўніцтве паўстаньнем на Літве і Беларусі. Імкнуўся далучыць да паўстаньня народныя масы.

**145** – 9.06.1868 г. нар. Уладзіслаў Вярыга (пам. 27.08.1916 г.), польскі філёзаф і этнограф, зьбіральнік беларускага фальклёру.

**140** – 21.06.1873 г. у Пеліканах ля возера Палік пад Барысавам памёр Вацлаў Пелікан (нар. 11.09.1790 г. у Слоніме), мэдык, грамадзкі і палітычны дзеяч.

**120** – 1.06.1893 г. у Варшаве памёр Аляксандр Валіцкі (нар. 27.01.1826 г. у Вільні), кнігар, выдавец, музычны крытык і сьпявак, выканаўца песень Станіслава Манюшкі і першы ягоны бібліёграф (у 1873 г. выйшла яго кніга пра С. Манюшку).

**105** – 21.06.1908 г. нар. Павал Шыдлоўскі, дзеяч самадзейнага мастацтва, заснавальнік Прысынкаўскага – найстарэйшага беларускага хору ў Заходняй Беларусі.

**105** – 21.06.1908 г. у Старэве на Случчыне нар. Сьцяпан Майхровіч, літаратуразнаўца. У 1943-1944 гг. рэдагаваў газэту “Белостокская правда”, пасьля вайны заняўся літаратуразнаўствам, напісаў манаграфіі пра Янку Лучыну, Вінцэнта Дунін-Марцінкевіча, Максіма Багдановіча, Францішка Багушэвіча, Янку Брыля, Івана Шамякіна ды гісторыю беларускай літаратуры. Памёр 2.07.1981 г.

**90** – 10.06.1923 г. у Варшаве памёр Міхал Фэдароўскі (нар. 1.09.1853 г. у Варшаве), фальклярыст, этнограф, клекцыянер, з 1877 г. амаль 30 гадоў жыў у Пружанскім павеце і збіраў беларускі фальклёр, які выдадзены ў 8 тамах пз. “Lud białoruski” (1897-1903, 1935-1981).

**100** – 20.06.1013 г. у Зарэччы на Браслаўшчыне нар. Фэлікс Журня, каталіцкі сьвятар, удзельнік беларускага хрысьціянскага руху. Закончыў гімназію у Друі , з 1932 г. – у ордэне айцоў мар’янаў. Высьвячаны на сьвятара ў 1943 г. Да 1966 г. жыў у Польшчы, прымаў удзел у дзейнасьці БГКТ у Варшаве. У 1966 г. пераехаў у Вялікабрытанію, дзе супрацоўнічаў з беларускім рэлігійным часопісам “Божым шляхам” і быў дзейным сябрам Беларускай каталіцкай місіі ў Вялікабрытаніі. Памёр 11.12.1982 г. у Лондане.

**95** – Летам 1918 г. успыхнулі антысавецкія паўстаньні і рухі за вольную Беларусь у Віцебскай і Магілёўскай губэрнях. Вызвольны рух крывава быў задушаны бальшавікамі.

**90** – 5.06.1923 г. у Вільні выйшаў з друку першы нумар газэты „Вольны Сьцяг” , органу Беларускай Рэвалюцыйнай Арганізацыі. Закрыты польскімі ўладамі, апошні нумар выйшаў 14.10.1923 г.

**90** – 28.06.1923 г. нар. Уладзімір Чантурыя (пам. у 1988 г.), архітэктар, пэдагог. Аўтар фундамэнтальнай кнігі „Гісторыя архітэктуры Беларусі да 1917 г.”.

**75** – 5.06.1938 г. расстраляны Юры Лістапад (нар. у красавіку 1897 г. у Варкавічах на Случчыне), кіраўнік беларускага руху на Случчыне, настаўнік.

**75** – 17.06.1938 г. расстраляны Аркадзь Смоліч (нар. 29.09.1891 г. у

Бацэвічах Клічаўскага раёна), географ і грамадзка-палітычны дзеяч. Закончыў Нова-Александрыйскі Інстытут Сельскай Гаспадаркі і Лесаводзіва ў Пулавах. У 1918 г. прымаў удзел у стварэньні Беларускай Народнай Рэспублікі, у яе ўрадзе быў народным сакратаром асьветы. Быў адным з заснавальнікаў Таварыства Беларускай Школы, працаваў настаўнікам у Віленскай Беларускай Гімназіі, напісаў падручнік „Геаграфія Беларусі" (1919); з 1923 г. у БССР – працаваў у Інбелкульце, Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, быў старшынёй Цэнтральнага Краязнаўчага Бюро Беларусі. З 1925 г. намесьнік старшыні Інбелкульта, з 1929 член Прэзыдыюма Акадэміі Навук Беларусі. У 1930 і 1937 гг. рэпрэсаваны.

**65** – 20.06.1948 г. у Вязынцы Маладзечанскага раёна быў адкрыты філіял Літаратурнага дома-музэя Янкі Купалы.

**55** – 8.06.1958 г. у Беластоку было заснавана Беларускае Літаратурнае Аб'яднаньне „Белавежа".

**45** – 26.06.1968 г. памёр у ЗША а. Сьцяпан Войтанка (нар. 28.10.1886 г.), праваслаўны сьвятар высьвячаны ў 1918 г. у Гародні, у 30-ыя гады быў настаяцелем Марозавіцкага прыхода на Гарадзеншчыне. У 1938 г. быў звольнены Гарадзенскай кансысторыяй за «супрацію палянізацыі праваслаўнай царквы» і за ўдзел сына Віктара ў віленскіх беларускіх арганізацыях. З 1944 г. у эміграцыі. У 1948 г. браў удзел у аднаўленьні БАПЦ, служыў настаяцелем прыхода Жыровіцкай Божай Маці ў Гайленд-Парку. Апошнія шады сьвятарства правёў у прыходзе БАПЦ у Нью-Брансвіку. Пахаваны ў Іст-Брансвіку.

**40** – 11.06.1973 г. у абацтве сьв. Пракопа у г. Лайл у ЗША памёр Ян Тарасевіч (нар. 30.10.1892 г. у Клешняках на Гарадзеншчыне), каталіцкі сьвятар, манах-бэнэдыктынец, дзеяч беларускага хрысьціянскага руху. З 1911 г. жыў у ЗША, у 1919-1925 гг. вучыўся ў Фрайбургу ў Нямеччыне, дзе абараніў доктарскую дысэртацыю па тэалёгіі, у 1923 г. высьвячаны на сьвятара. Быў дзеячам беларускага руху ў ЗША, супрацоўнічаў з беларускімі выданьнямі, м. інш. з «Хрысьціянскай думкай», «Божым шляхам».

**25** – 19.06.1988 г. у Менску адбыўся мітынг памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсіяў.

**10** – 22.06.2003 г. у Менску памёр Васіль Быкаў (нар. 19.06.1924 г. у Бычках на Віцебшчыне), выдатны беларускі пісьменьнік.

*Апрацавалі* **Лена Глагоўская** і **Вячаслаў Харужы**

# *Kaliś śpiawali*

## Hore prymak

Sukowiczy
N. Kozakiewicz

Umiarkowanie /20"/

1. Ho-re pry--mak, ho- re, na swiet po - hle-da - je.
U-sie żo-nki jeść nia-sut, a ma-ja nie zna - je.
2. Pry - nia-sła ja - na mnie jeść le - bja - dy, biez so - li.
4. Jak pry - je - chaŭ jon da do - mu, nie ŭspieŭ z.wo--za zle-zci,
5. Ach, kab świ - ni pa - zdy - cha - li, a cha - ta zha - re - ła...
coda
Na-sior-baŭ-sa, na-klo-waŭ - sa i ska-zaŭ: da - wo - li.
wy - la - ta - je sta-ra cio--szcza, nia - si świ-niam je - ści!
3. Jak nie cho--czasz le - bja-dy, to jeż chleb z wa-do - ju.
i kan- czaj chut- czej ha-rać, pry-jaż-dżaj da do - mu!

1. Hore prymak, hore –
Na swiet pohledaje.
Usie żonki jeść niasut, *
A maja – nie znaje.

2. – Pryniasła jana mnie jeść
Lebjady – biez soli.
– Nasiorbaŭsa, naklowaŭsa
I skazaŭ : dawoli.

3. – Jak nie choczasz lebjady,
To jeż chleb z wadoju.
I kanczaj chutczej harać –
Pryjażdżaj da domu.

4. Jak pryjechaŭ jon da domu –
Nie ŭspieŭ z woza zlezci.
– Wylataje stara cioszcza –
Niasi świniam jeści !

5. – Ach, kab świni pazdychali,
A chata zhareła,
Jak mie uże prymackoje
Życie nadajeła.

*3 i 4 radki paŭtarać u kożnaj zwarotcy.

Sa zbornika „Biełaruskija piesni Sakolskaj ziamli", Krynki 2012. Ad Nadzieji Kazakiewicz (1921 h. naradż.) u Sukawiczach, Szudziałaŭskaja hm. zapisaŭ 7.V.1997 h. i aprac. **Sciapan Kopa**

# *Лёс слонімскіх кнігазбораў і рукапісаў*

Доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс меў рацыю, калі сказаў, што „Беларусь з’яўляецца адзінай краінай у свеце, краінай-выключэннем, дзе нацыянальных культурных скарбаў, матэрыяльных і духоўных на радзіме меней, чым за яе межамі. Прычынай таму ваенныя навалы, што хвалямі пракочваліся праз нашу зямлю, і драпежніцкая палітыка суседзяў” (зборнік „100 пытанняў з гісторыі Беларусі”. Мн., 1993. С.73). У гэтым упэўніваўся і я асабіста, калі бачыў, напрыклад, старадаўнія слонімскія зборы ў музеях Польшчы, Швецыі, Літвы, Расіі.

Сёння цяжка і нават немагчыма пералічыць усе тыя нацыянальныя багацці, што стагоддзямі вывозіліся толькі, прыкладам, са слонімскай зямлі ў блізкія і далёкія краіны свету. Найбольш слонімскіх скарбаў знікла падчас розных войнаў, але найбольш – у часе Першай і Другой сусветнай. На захад і ўсход захопніцкім шляхам вывозілі са Слонімшчыны разам з рознымі скарбамі і каштоўныя кнігі, а таксама старыя рукапісы. Шмат разоў рабаваліся слонімскі музей, архівы, Жыровіцкая семінарыя, палац Слізняў у вёсцы Дзевяткавічы, тэатр Агінскага ў Слоніме і палац Пуслоўскіх у Альбярціне. Рабаваліся таксама праваслаўныя, каталіцкія і ўніяцкія храмы, мячэці, сінагогі і цэрквы іншых канфесій слонімскай зямлі.

У красавіку 1613 года пачалося будаўніцтва Жыровіцкага ўніяцкага манастыра і царквы, дзе знаходзіўся цудатворны абраз Жыровіцкай Багародзіцы. Ствараў гэты найважнейшы рэлігійны асяродак Язафат Кунцэвіч, а яго фундатарамі былі Ян Мялешка, Даніла Солтан і Рыгор Трызна. Жыровіцкі абраз прыцягваў сотні тысяч пілігрымаў. А пасля далучэння Беларусі да Расіі Жыровічы адышлі да праваслаўнай царквы. Але на працягу чатырох стагоддзяў Жыровічы рабавалі чужынцы з захаду і з усходу, з поўдня і з поўначы. А рабаваць было што, бо ў манастыры знаходзілася вялікая бібліятэка, архіў і свая друкарня. А ў 1842 годзе біскуп Язэп Сямашка пачаў у Жыровіцкім манастыры спальваць уніяцкія старадрукі. Напачатку кнігамі распальвалі печы, а пасля яны гарэлі ў вогнішчы на пляцу. На працягу 10 гадоў паводле загаду Сямашкі спалілі некальkі тысяч беларускіх уніяцкіх старадрукаў. А тыя, што не згарэлі, укралі і вывезлі ў іншыя дзяржавы.



**Старыя кнігі і рукапісы з Жыровіцкага манастыра можна знайсці ў архівах многіх краін Еўропы**

У архіве Санкт-Пецярбургскага аддзялення Інстытута гісторыі Расійскай акадэміі навук сёння шмат цікавых дакументаў, якія маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі Жыровічаў. У фондзе былога прафесара Жыровіцкай духоўнай семінарыі Пракопа Нілавіча Дабрахотава (Максімава) значацца 2 492 адзінкі захавання збораў на польскай, лацінскай і старабеларускай мовах. Гэтыя сабраныя рарытэты Дабрахотаў вывез з Жыровічаў яшчэ ў 1845 годзе. Найперш, гэта дэкрэт Слонімскага земскага суда па справе паміж Іванам Мялешкам і Данілам Солтанам за Жыровічы, 1609 года; выпіс са слонімскіх земскіх кніг запісу Івана Аляксандравіча Солтана аб перадачы маёнтка Жыровічы сваёй жонцы, 20.09.1572 года; пасланне кіеўскага уніяцкага мітрапаліта Антонія Сялявы да Жыровіцкага суперыёра Канстанціна Вітапольскага, 23.06.1653 года; спіс вучняў Жыровіцкай школы XVIII стагоддзя; зборнік гістарычных звестак пра Жыровіцкі мана-

стыр з апавяданняў і спраў старых людзей, што заслугоўваюць даверу, склаў Антоній Завадскі, 1713 год; кніга найдаўнейшых цудаў абраза Жыровіцкай Маці Божай, XVII стагоддзя; акт продажу Данілам Солтанам маёнтка Жыровічы з прысёлкамі літоўскаму канцлеру Льву Сапегу, 06.07.1621 года; вопісы Жыровіцкага манастыра – 1753 г., 1778 г., 1785 г., 1800 г. і іншыя. Там захоўваюцца таксама пратаколы Жыровіцкай генеральнай кангрэгацыі айцоў базыльянаў, 1792 года; нумары штодзённага часопіса суперыёраў Жыровіцкага манастыра, 1772–1786 гадоў; заўвагі Паўла Дабрахотава з гісторыі Брацтва пры Жыровіцкім абразе Маці Божай, 1837–1863 гадоў, і дзесяткі іншых каштоўнасцей.

У архіве Санкт-Пецярбургскага аддзялення захоўваюцца і копіі дакументаў пра мястэчка Жыровічы, зборнік гістарычных звестак пра Жыровічы, 1713 года, апісанне Жыровіцкага манастыра ў 1713 годзе, панегірык шведскаму каралю Густаву Адольфу на лацінскай мове, складзены ў Жыровічах, а таксама зборнікі Антонія Завадскага, дзе маецца шмат звестак пра Жыровічы і суседні з Жыровічамі Быцень.

Беларускія літаратуразнаўцы і гісторыкі Адам Мальдзіс і Язэп Янушкевіч выявілі ў аддзеле рукапісаў фонду базыльянскіх манастыроў навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны ў Львове матэрыялы на польскай мове пра апісанне цудаў у Жыровічах 1758 года, апісанне цудаў у манастырскай царкве ў Жыровічах 1620-1756 гадоў. А ў Нацыянальным дзяржаўным гістарычным архіве ў Львове гэтымі навукоўцамі знойдзены звесткі пра гісторыю царквы ў Слоніме, выяўлены кніга ўліку прыхаджан, якія спавядаліся ў царкве ў Жыровічах у 1791–1800 гадах, звесткі пра маёмасць манастыроў у Быцені і ў Жыровічах, матэрыялы базыльянскага манастыра ў Жыровічах, справаздача аб праверцы бібліятэкі Жыровіцкага вучылішча ў XIX стагоддзі, справа аб папаўненні бібліятэкі ў Жыровічах (XIX ст.) і справа пра ўніяцкія кнігі, канфіскаваныя ў Жыровічах.

У 1983 годзе Адам Мальдзіс і Іван Крамко апублікавалі створаныя ў 1622 годзе творы жыровіцкага манаха Феадосія Баравіка, напісаныя на ўзорнай беларускай літаратурнай мове XVII стагоддзя „О абразех, о реліквях” і „Гісторыа або повесть людзей розных, веры годных о образе чудовном пренаісвятейшое девы Марыі жыровіцком в повете Слонімском…”, арыгіналы якой зберагаюцца ў бібліятэцы Акадэміі навук у Санкт-Пецярбурзе. Дарэчы, у Жыровіцкай базыльянскай уніяцкай калегіі ў XVIII стагоддзі працаваў школьны тэатр. Пры жыровіцкім кляштары існавала багатая бібліятэка з рэлігійнымі і свецкімі творамі як беларускіх, так і антычных аўтараў, шматлікімі граматыкамі, слоўнікамі, азбукоўнікамі, букварамі і г.д.

Акрамя як у Жыровічах, рабаваліся храмы розных канфесій і ў Слоніме. Пасля паўстання 1863 года руская царская ўлада пачала закрываць каталіцкія касцёлы. У снежні 1864 года расфармавалі бібліятэку касцёла бернардзінцаў у Слоніме. Рукапісы і многія кнігі касцёла апынуліся ў Віленскай цэнтральнай публічнай бібліятэцы. А касцельная бібліятэка ў Слоніме тады складалася з 2 774 тамоў, пераважна старадрукаў. Поўны каталог кніг за 1798 і 1845 гады на сённяшні дзень захоўваецца ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта. А ў Кракаве ў архіве айцоў канонікаў рэгулярных лютэранскіх захоўваецца рукапісны (без сігнатуры) каталог бібліятэкі слонімскага кляштара канонікаў лютэранскіх за 1705 год.

Вывезлі ў Львоў і ў Ватыкан увесь уніяцкі архіў з Альбярціна. Сёння ў бібліятэцы Russicuma ў Італіі можна знайсці шмат дакументаў, кніг, фотаздымкаў, поўны збор часопіса „Да Злучэньня” і шэраг іншых матэрыялаў, якія расказваюць пра цэнтр уніяцкага руху ў перыяд міжваеннага дваццацігоддзя (1921–1939 гады) у Альбярціне. У бібліятэцы Russicuma мне нават не дазволілі зрабіць ксеракопіі ўсіх нумароў часопіса „Да Злучэньня”, маўляў, гэта каштоўныя выданні і іх нельга прапускаць праз сканер.



**З палаца Пуслоўскіх на захад і ўсход зніклі сотні рукапісаў і кніг**

У сярэдзіне XIX стагоддзя ў вёсцы Дзевяткавічы на Слонімшчыне быў пабудаваны трохпавярховы палац прадстаўнікоў беларускага шляхецкага роду Слізняў у стылі рэтраготыка. На самы вялікі жаль, да сённяшняга часу палац Слізняў не збярогся, зніклі з яго ў невядомых кірунках тысячы каштоўнасцей, якія збіраліся Слізнямі на працягу трох стагоддзяў, у тым ліку кнігі і рукапісы. Расцягнулі бібліятэку палаца, дзе знаходзіліся рэдкія старадаўнія выданні, хронікі, радзівілаўская Біблія, кнігі, выдадзеныя ў Рыме, Антверпене, Жэневе, творы французскіх класікаў, паэзія Вергілія і Гарацыя, слоўнікі і энцыклапедыі.

Апусцеў у 1914–1944 гадах і палац Пуслоўскіх у Альбярціне. Рабавалі яго бальшавікі і немцы. Сёетое Пуслоўскім удалося вывезці ў Вялікабрытанію. Але большая частка альбярцінскіх каштоўнасцей паехалі ў Германію і Расію.

Газета „Тыдзень Польскі", якая выдаецца ў Лондане, змясціла ў 2004 годзе пад рубрыкай „На Крэсах" артыкул „Альбярцін" Р. Міроўскага, дзе падрабязна апісваецца сядзіба Пуслоўскіх у Альбярціне каля Слоніма. Аўтар прыводзіць звесткі пра музейныя, архіўныя і бібліятэчныя каштоўнасці, якія захоўваліся ў мясцовым палацы. Бібліятэка магла ганарыцца польскімі і італьянскімі выданнямі XVII стагоддзя, энцыклапедыямі, атласамі і геаграфічнымі картамі. У архіве захоўваліся дакументы на пергаменце (некаторыя нават з XV стагоддзя).

Паводле Р. Міроўскага, усе зборы ў час Першай сусветнай вайны, калі пачалося нямецкае наступленне, вывезлі з Альбярціна ў Маскву. На гэтым іх сляды губляюцца. Згубіліся сляды і каштоўнасцей, вывезеных з палаца Льва Сапегі, а пасля з тэатра Міхала Казіміра Агінскага са Слоніма. Вывозіліся найперш музычныя інструменты, карціны, нотныя сшыткі, кнігі спачатку ў Польшчу, а пасля ў Расію.

Рабаваўся Слонім і ў сярэдзіне XIX стагоддзя і ў XX стагоддзі. Але былі ў гэтым старажытным горадзе людзі, якія іх і зберагалі ад рабаўнікоў. Гэта краязнавец, гісторык і археолаг Язэп Стаброўскі. Дзякуючы яму, у верасні 1929 года на аснове ўласных археалагічных, нумізматычных, этнаграфічных і бібліяфільскіх калекцый Язэп Стаброўскі адкрыў у Слоніме краязнаўчы музей. У музеі налічваліся сотні найкаштоўнейшых экспанатаў, якія Язэп Стаброўскі збіраў усё жыццё. А пасля іх, якія змог, аберагаў ад польскіх, нямецкіх і савецкіх рабаўнікоў.

Газета „Савецкая Беларусь" за 1944 год (№141) пісала: „Калі ў Слонім уварваліся гітлераўцы, перад Язэпам Стаброўскім паўстала пытанне – што рабіць з экспанатамі? Акупанты могуць знішчыць усё, чаму аддадзена столькі гадоў жыцця… Трэба схаваць экспанаты. Але куды? Закапаць у зямлю – сапсуюцца… І ўсё ж дарагія экспанаты былі схаваны ў закрытыя шафы… Шафы Язэп Язэпавіч засунуў у далёкі кут пакоя і закідаў рыззём. Аднойчы ён выйшаў на гарадскую плошчу. У гэты час немцы прывезлі на грузавіках і скінулі на брук тысячы кніг. „Спаліць!" – загадаў камендант. Уначы, не адчуваючы стомы, Стаброўскі цягаў мяшкамі кнігі дадому. Тады яму ўдалося схаваць у надзейным месцы тысячы тамоў, якія пазней перадалі раённай бібліятэцы".

На жаль, большая частка каштоўных экспанатаў, сабраных Язэпам Стаброўскім, бясследна знікла. У аўтара гэтых радкоў у хатнім архіве захоўваецца акт ад 30 верасня 1944 года, у якім пералічаны разрабаваныя падчас нямецка-фашысцкай акупацыі каштоўнасці. На працягу чатырох гадоў са слонімскага музея зніклі дзесяткі каштоўных экспанатаў. Сярод іх былі кнігі і рукапісы.

Гэта 514 кніг старых выданняў на рускай, польскай, лацінскай, французскай, беларускай, шведскай, нямецкай і іншых мовах. 372 кнігі рускіх класікаў і акадэмічныя выданні ў скураных пераплётах. Гэта навуковыя працы Язэпа Стаброўскага: калекцыя фотаздымкаў курганоў, альбом з малюнкамі (каля 3 000 штук), рукапісныя сшыткі па археалогіі, якія пісаліся і збіраліся на працягу 52 гадоў.


Язэп Стаброўскі выратаваў шмат слонімскіх старых кніг і рукапісаў

Акрамя вышэйпералічаных каштоўнасцей, немцы вывезлі 180 карцін слонімскага мастака Антона Карніцкага, разрабавалі фотамайстэрню Юзэфа Шыманчыка, хату-музей Гальяша Леўчыка. З фотамайстэрні зніклі сотні негатываў і рэдкіх фотаздымкаў. З хаткі Гальяша Леўчыка прапалі каштоўныя газеты, часопісы, кнігі, фотаздымкі, пісьмы, паштоўкі, рэлігійныя выданні. Ды і саму гістарычную хатку знішчылі ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Вялікая слонімская калекцыя старажытнасцей Гальяша Леўчыка бясследна прапала і з варшаўскай кватэры, якая знаходзілася ў доме № 50 на Кашыковай вуліцы.

Пацiху зніклі каштоўнасці са Слоніма і ў пасляваенны час. Вось адзін невялікі прыклад, звязаны ўсё з тым жа Язэпам Стаброўскім.

...У 1812 годзе, калі адступала французская армія, у дом бабулі Стаброўскага забег паранены французскі афіцэр і папрасіў дапамогі. У знак падзякі ён падараваў карту

заходніх раёнаў Расійскай імперыі з пазначанымі мясцінамі, дзе французы захавалі нарабаваныя каштоўнасці. На жаль, да раніцы вайсковец напалеонаўскай арміі не дажыў. Стаброўскія яго пахавалі, а карта засталася ім. Гэтую карту бабуля Стаброўскага перадала сваёй дачцэ, а тая перад смерцю – свайму сыну Язэпу. Язэп Стаброўскі вельмі яе шанаваў і зберагаў.

Аднойчы ў 60-х гадах мінулага стагоддзя музей у Слоніме наведаў нехта Л. Аляксееў – супрацоўнік Інстытута археалогіі АН СССР. І Стаброўскі паказаў яму гэтую сямейную рэліквію. Аляксееву яна адразу кінулася ў вочы. Але Стаброўскі карту нікому не даваў. Тады Аляксееў пачаў наведвацца ў Слонім часцей, пакуль не выманіў у Язэпа Язэпавіча на невялікі тэрмін гэтую каштоўнасць нібыта для навуковых даследаванняў. З той пары няма ні Аляксеева, ні карты. Стаброўскі некалькі разоў пісаў у Інстытут археалогіі, тэлефанаваў, але нічога не дабіўся – карта знікла назаўсёды. І такіх прыкладаў можна прывесці вельмі шмат.



**Жыровіцкае Евангелле знаходзіцца ў Літве**

Сёння ў архівах Польшчы вельмі шмат захоўваецца слонімскіх кніг і старадаўніх дакументаў. У Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве я асабіста трымаў у руках рукапіс „Легенды" Язэпа Стаброўскага на польскай мове. Там таксама захоўваюцца „Лісты самотнай" Юліі Ціцюс са Слонімскага павета ў рэдакцыю газеты „Kurier Wilenski" пра стан адукацыі, погляды шляхты ў сярэдзіне XIX стагоддзя.

Ва ўніверсітэцкай бібліятэцы ў Варшаве ў рукапісны аддзеле захоўваюцца беларуская „Прамова Мялешкі", апісанне падарожжа невядомай аўтаркі са Слоніма на французскай мове, інвентары слонімскіх маёнткаў Стравінскіх. У бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта зберагаюцца рукапісныя матэрыялы пра слонімскіх бернардзінцаў XVIII стагоддзя, а ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Чартарыйскіх захоўваюцца „Пасяджэннні Брэсцкай капітулы ў Жыровічах", 1808 года, а таксама візітацыя Лукавецкага касцёла ў Слонімскім дэканаце, 1850 года. Ёсць там і шмат касцельнай слонімскай дакументацыі XIX стагоддзя. У бібліятэцы ў Курніку (аддзел рукапісаў) у Познані захоўваецца інвентар вёсак, якія належаць да фальваркаў Слонімскага староства, XVI-XVII стагоддзяў.

У рукапісным фондзе № 21 Навуковай бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы таксама захоўваецца шмат слонімскіх рукапісаў, кніг, фотаздымкаў. Многія я бачыў, трымаў у руках, нават некаторыя перапісаў для сябе. Гэта аповесць і вершы Анатоля Іверса (спр. 187), творы Кандрата Лейкі „Беларусы-бежанцы на Украіне", „Маці і дзеці" (фрагмент), лісты ў рэдакцыю „Нашай нівы", успамін з „Нашай нівы", апавяданні „Гарасімаў грэх", „Кульгавы дзядзька", „Апанас Крэнт" (спр. 254), пісьмы Гальяша Леўчыка (спр. 260), верш Якуба Міско „За што?" (спр.404), акты роду Сапегаў (спр. 1113-1120) і сотні іншых.

Дарэчы, у архівах Харкава на Украіне таксама захоўваецца шмат матэрыялаў і твораў Кандрата Лейкі. Некаторыя мне ўдалося розным чынам купіць, абмяняць і вярнуць на Радзіму. Яны цяпер захоўваюцца ў маім хатнім архіве.

У Санкт-Пецярбургскім аддзяленні архіва Расійскай Акадэміі навук знаходзіцца шмат цікавых і арыгінальных дакументаў, звязаных з жыццём і творчасцю нашага земляка доктара філалагічных навук, літаратара і перакладчыка Канстанціна Пушкарэвіча. Гэта анкета ад 7 лістапада 1922 года, запоўненая К. Пушкарэвічам, асабістая справа аб зацвярджэнні К. Пушкарэвіча ў званні дацэнта (1935-1939), справа аб абароне К. Пушкарэвічам доктарскай дысертацыі на тэму „Чэхі ў Расіі" (1940) і многія іншыя.

5 лістапада 1940 года старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Нікіфар Наталевіч звярнуўся да „Да ўсіх старшынь абласных і раённых выканаўчых камітэтаў, гарадскіх Саветаў, дырэктараў музееў". Пачынаўся дакумент з вельмі трывожных слоў: „У апошні час назіраюцца выпадкі вывазу living рознымі навуковымі ўстановамі і нават прыватнымі асобамі важнейшых навукова-гістарычных каштоўнасцей, якія зберагаюцца ў архівах БССР, музеях, былых палацах, сядзібах і г.д., якія адбываюцца без дазволу ўрада БССР. Так была вывезена ў пачатку верасня б.г. вельмі каштоўная ў гістарычных адносінах бібліятэка былой Пінскай каталіцкай семінарыі ў колькасці 30 тысяч тамоў. Такім жа чынам было перададзена, якое зберагалася да сённяшніх дзён у Слонімскім раённым музеі, арыгінальнае пісьмо Пушкіна…" Гэты спіс слонімскіх кнігазбораў і рукапісаў, які знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь, можна яшчэ доўга працягваць. Але я ўсё ж застаюся аптымістам, што некалі наша Бацькаўшчына і мой народ стануць жыць заможна, а ўкрадзеныя і вывезеныя ва ўсе канцы свету каштоўнасці, пачнуць вяртацца на Беларусь і, у прыватнасці, на нашу Слонімшчыну. Вяртаць на Радзіму мы будзем іх па-рознаму, у тым ліку і выкупляць, абменьваць, вяртаць дыпламатычнымі шляхамі.

**Сяргей Чыгрын**

# *Leon Moenke* Stawka o życie

*17*. Stanęliśmy, przyglądając się tej scence. Łódkarz mile się do nas uśmiechnął, jak do starych znajomych, widząc życzliwość naszego spojrzenia, skierowanego na jego dziecko.

– W jakim wieku wasz synek? – zapytałem.

– A już ma sześć lat, siódmy rok zaczął, prędko będzie chodził do szkoły – odparł szczęśliwy i dumny tatuś.

Malec zwrócił ojcu lornetkę i pobiegł.

– Czy możemy i my popatrzeć trochę przez lornetkę? – zwróciłem się do niego.

– Ależ bardzo proszę! – i podał ją nam.

Była to polowa lornetka Zeissa. Znowuż popatrzyłem na brzeg sowiecki, fort, morze i brzeg fiński. Mimo woli zatrzymałem na nim wzrok trochę dłużej, tak mnie pociągał ku sobie.

– Patrzyliście na brzeg fiński? – zapytał mnie, gdy podałem lornetkę żonie.

– A tak. Ciekawa rzecz spojrzeć tak z bliska na kraj wrogów naszych – odparłem bez namysłu. – Ten sam krajobraz, te same lasy, pagórki i łąki, a jakżeż odmienny ustrój, jak inaczej żyją ludzie! Pewnie nieraz robotnicy próbują przedostać się stamtąd?

– Zdarza się czasem, że i robotnik nie mający pracy, ale przeważnie szpiedzy. Otóż podczas tej zimy, gdy zamarzła zatoka, to jeden z nich nałożył na siebie biały płaszcz i zmylił w dzień wszystkie straże. Dostał się już daleko w głąb i tylko po śladach wykryto go i złapano, zanim zdołał się ukryć we wsi – z przejęciem opowiadał „seksot" (tajny agent G. P. U.).

–No, ale teraz latem, to zapewne i nie próbują morzem... Jadąc łódką, widziałem tę wieżę nad lasem. Tu się nikt nie przemknie, nawet gdyby pływał jak ryba.

Mój rozmówca uśmiechnął się na te słowa pobłażliwie i pokiwał głową z powodu mojej „naiwności".

– Co tu mówić o pływaniu, kiedy ja nawet łódką w zeszłym roku przejechałem do Finlandii i dopiero gdy na drugi dzień wracałem, urządzono mi uroczyste spotkanie. Sam naczelnik tutejszej straży pogranicznej przyjechał na koniu na moje spotkanie – wesoło zażartował „seksot".

– Ależ w jaki sposób to się stało? – zdziwiłem się szczerze.

– A bardzo prosto – opowiadał chętnie gadatliwy „seksot". – Była burza. Jedną z łódek burza zerwała z łańcucha. Pogoniłem za nią na innej łodzi, złapałem, lecz już wrócić do naszego brzegu nie mogłem: burza pognała mnie na brzeg fiński. Fale były takie, że myślałem, iż utonę, lecz nikt nie tylko nie pośpieszył mi z pomocą, lecz nawet nie zauważono mnie – dodał z odcieniem goryczy. Widać było, że krucho mu wtedy było i spodziewał się, iż go zauważą i przyjdą mu z pomocą.

– Jak to? Nie zauważono was z łódkami ani z wieży nad lasem, ani ze stacji ratunkowej?

– A cóż wy myślicie? Dużo można z tych wież zobaczyć? Jak się fale rozszaleją! Toż wyrzucą na chwilę i znowu schowają, a wszystko się pieni i rusza...

– Tak, w czasie wielkiej burzy, w tak wyjątkowych warunkach, to się może zdarzyć. Ale wątpię, byście mogli nie tylko w łódce, lecz i bez niej, jedynie o własnych siłach przepłynąć niepostrzeżenie do Finlandii przy takiej pogodzie jak teraz, przy tych falach, przy tym jasnym blasku słonecznym – oponowałem mu w dalszym ciągu.

Z uśmiechem wyższości znów spojrzał na mnie.

– Mylicie się znowuż. Chociaż fale są i niezbyt wielkie, to akurat ten blask słoneczny by mnie osłaniał. Kto wie, może bym wygrał z wami zakład.

W jakiś sposób osłaniałby was blask słoneczny? – zdziwiłem się po raz wtóry.

– A spójrzcie na zachód na morze w tej chwili. Czy nie oślepia was ten blask? – zapytał z triumfującym uśmiechem.

– A rzeczywiście – rzekłem po chwili patrzenia na te roztopione złoto na zachodzie. – Macie rację.

Gadatliwy „seksot" wyśpiewał mi wszystko, co potrzebowałem wiedzieć, a nad czym przed chwilą łamałem sobie głowę. Teraz zrozumiałem, dlaczego u podstawy cypla siedziało aż dwóch naraz gepistów. Patrzyli biedacy, na zmianę. Teraz zrozumiałem też, dlaczego jest tak dużo punktów obserwacyjnych. Więcej jeszcze – swym autorytetem potwierdził on wobec żony realność mego planu ucieczki pomimo całej czujności G. P. U.

Zadowolony z tego wywiadu z „czujnym" agentem G. P. U. zacząłem się z nim żegnać. Teraz dopiero przypomniał sobie o obowiązkach.

– A coście za jedni? – zwrócił się do mnie.

– Jesteśmy turyści. Przyjechaliśmy z Leningradu zwiedzić uzdrowisko Siestroreckie.

– O, wobec tego musicie przed godz. 10 wracać z powrotem do Leningradu. Tu wolno jest przebywać tylko do godz. 10 wieczór.

– Dziękujemy bardzo za tę informację. Do widzenia.

– Do widzenia.

Zdecydowałem pozostać do godziny 10, by poznać jak najdokładniej życie uzdrowiska Siestroreckiego.

*„Kurier Wileński" nr 48, 18.02.1938 r., s. 5*

Wieczór był jasny i ciepły. Od morza wiał lekki orzeźwiający wiaterek, toteż żona moja chętnie przystała na tę propozycję. Spacerowaliśmy po sztrandzie. Napawałem się pięknem tego czerwcowego wieczoru nad morzem i pogodnym, iście wiejskim spokojem. Miarowy, lekki poszum fal

podkreślał tylko ten spokój i ciszę. Wtem tuż koło nas rozległ się charkot megafonu:

*Towarzysze! Uwaga! Dziś CKW ZSSR uchwalił nowy dekret. Ze względu na jego znaczenie dla strefy pogranicznej odczytujemy go w całości. Uwaga! Słuchajcie!*

*„Uchwała Centralnego Komitetu Wykonawczego Związku SSR.*

*Centralny Komitet Wykonawczy Związku SSR uchwalił:*

*Uzupełnić przepisy o przestępstwach wobec państwa (kontrrewolucyjnych i szczególnie dla Związku SSR niebezpiecznych przestępstwach przeciw porządkowi prawnemu) artykułami 1.1-1.4 treści następującej:*

*1.1 Zdrada ojczyzny, tj. czyny dokonane przez obywateli Związku SSR na niekorzyść siły obronnej Związku SSR, jego niezależności państwowej lub całości jego terytorium, jako to: szpiegostwa, zdrada wojskowych lub państwowych tajemnic, przejście na stronę nieprzyjacielską, ucieczka za granicę*[1] *– będą karane najwyższą przewidzianą w kodeksie karą – rozstrzelaniem z konfiskatą całej majętności, a przy okolicznościach łagodzących – pozbawieniem wolności na okres 10-letni z konfiskatą całego mienia.*

*1.2 Te same przestępstwa dokonane przez osoby wojskowe będą karane najwyższą przewidzianą w kodeksie karą – rozstrzelaniem.*

*1.3 W razie ucieczki za granicę osoby wojskowej, pełnoletni członkowie jego rodziny, jeżeli w jaki bądź sposób współdziałali w przygotowaniu lub dokonaniu zdrady lub chociażby wiedzieli o niej, lecz nie zakomunikowali o tym władzy – będą skazani na pozbawienie wolności na 5 do 10 lat z konfiskatą całego mienia.*

*Pozostali pełnoletni członkowie rodziny zdrajcy, zamieszkujący razem z nim lub znajdujący się na jego utrzymaniu do chwili dokonania przestępstwa – będą pozbawieni praw wyborczych i zesłani do dalekich rejonów Syberii na termin 5 lat.*

*1.4 Za niedoniesienie o przygotowującej się lub dokonanej zdradzie osoby wojskowe będą karane więzieniem 10 lat.*

*Pozostali obywatele (nie wojskowi) za niedoniesienie będą karani zgodnie z art. 12 niniejszych przepisów.*

*Przewodniczący Centralnego Komitetu Wykonawczego Związku SSR M. Kalinin.*

*W/z sekretarz Centr. Komit.*
*Wyk. Związku SSR A. Miedwiediew.*
*Moskwa, Kreml, 8 VI 1934 r.”*

*Jutro dekret ten zostanie opublikowany w prasie. Towarzysze bądźcie ostrożni w strefie przygranicznej, gdyż oskarżenie o usiłowanie przekroczenia granicy grozi karą śmierci.*

Jak raptownie odezwał się, tak też i umilkł megafon.

– Słyszałaś? Nie wierzyłaś mi, gdym ci mówił, iż w Związku Sowieckim, jak za czasów niewolnictwa i feudalizmu, obowiązuje prawo odpowiedzialności zbiorowej: żony za męża, siostry za brata, rodziców za dzieci i odwrotnie. Nie wierzyłaś, że jesteśmy przykuci jedno do drugiego. Nie wierzyłaś mi, pomimo że cię wyrzucono z uniwersytetu niezwłocznie po mnie. Cóż teraz powiesz?

– Uciekajmy razem – odpowiedziała żona głucho.

– Ale, w razie przyłapania, grozi ci niechybna śmierć, zarówno jak i mnie. Nic nie pomoże ci branie przeze mnie winy wyłącznie na siebie. Jako lektorka Akademii podlegasz prawom wojskowym.

– Wiem o tym. Zdecydowałam się.

[1]Podkreślenie moje – L.M.

*„Kurier Wileński” nr 49, 19.02.1938 r., s. 5*

Ostatnim pociągiem, o godz. 10 wieczór, opuszczaliśmy Siestroreck. Byłem bardzo zadowolony. Cieszyło mnie przede wszystkim, iż CKW swym autorytetem raczył uświadomić nawet tak pełną „przesądów burżuazyjnych” głowę, jaką posiadała moja żona. Jeszcze bardziej cieszyły mnie wyniki naszych zwiadów i wywiadów.

Byle prędzej tylko ocieplała woda w morzu – myślałem.

## Wiatr od wschodu

Nazajutrz po obiedzie znów byliśmy w uzdrowisku. Dzień był tak samo upalny, jak onegdaj. Już jadąc cieszyłem się, że temperatura wody znowuż się podniosła i, jeżeli dnia poprzedniego wynosiła 14,5° C, to teraz na pewno będzie już co najmniej 16° C, jeśli nie wyższa.

W doskonałym nastroju, pełni nadziei, omal że pewności, weszliśmy do parku i udaliśmy się do gmachu zarządu uzdrowiska, by tam przeczytać biuletyn meteorologiczny.

Lecz jakież było nasze zdziwienie, gdy ujrzeliśmy spadek temperatury. Wprost oczom swym nie wierzyłem. Temperatura z 14° C, spadła na 13° C. Zakrawało to na żart.

– Co to jest? Zamiast podnosić się od upału, temperatura spada?! – dziwiłem się.

Umoczenie rąk w morzu przekonało nas jedynie, że jeśli woda nie jest zimniejsza, to w każdym bądź razie nie cieplejsza od onegdajszej.

– Zapewne była bardzo zimna noc – zawyrokowałem. Lecz przy takim upale, jaki jest dzisiaj, temperatura wody jutro na pewno się podniesie.

Rzecz jasna, iż przy tej temperaturze o ucieczce nie można było i myśleć. Jedynie bowiem przy temperaturze 16-18° C mogliśmy próbować ucieczki bez ryzyka zamarznięcia w wodzie. Wróciliśmy więc z kwitkiem do Leningradu.

* * *

Po upalnym dniu i pogodnej ciepłej nocy byliśmy zaskoczeni biuletynem i dnia następnego. Temperatura wody, wbrew wszelkiej logice, spadła ponownie. Co prawda, już tylko o pół stopnia C.

– Dwanaście i pół – przeczytałem ze zdumieniem większym, niż dnia poprzedniego.

– Co to jest?! – nie mogłem się już teraz nadziwić. Co za przyczyna takich wolnych żartów ze strony morza?

Lecz na te pytania daremnie siliłem się znaleźć odpowiedź.

– Wiesz co - zwróciłem się do żony – nie pozostaje nam nic innego jak znowuż zasięgnąć informacyj u „seksota” łódkarza. Ten już na pewno potrafi zjawisko to wytłumaczyć.

– Towarzyszu! Co za dziwy się tu u was dzieją? Takie upały! Kąpać się chce aż strach, a temperatura wody, zamiast podnosić się, już drugi dzień spada?

Znów z uśmiechem wyższości spojrzał na nas łódkarz „seksot”:

– Toż to wiatr wieje od wschodu.

Ze zdziwieniem spojrzeliśmy po sobie jakby mówiąc:

– Co ma wiatr do wody?

Nie uszło to uwagi „seksota”.

– Jacy wy jesteście niedomyślni, towarzysze! Ten właśnie wiatr spędza całą ogrzaną wodę w otwarte morze, a na to miejsce przychodzi z dołu zimna.

– A niech licho porwie ten wiatr od wschodu! – zakląłem w duszy.

– Patrz, Lonku, jak spokojne, jak ciche jest teraz morze! Niby jezioro jakieś.

– Bo to wieje wiatr od wschodu – odpowiedziałem.

*„Kurier Wileński” nr 50, 20.02.1938 r., s. 7*

*Cdn*

# *Аляксандр Грачанінаў жыў беларускай песняй*

У пачатку сакавіка 1937 года, праездам з Францыі ў Фінляндыю, на некалькі дзён затрымаўся ў Рызе вялікі рускі кампазітар Аляксандр Грачанінаў (1864-1956). А 5 сакавіка ў сталіцы Латвіі адбыўся ягоны аўтарскі вечар. Поўная зала гледачоў і слухачоў, дзе выступаў кампазітар, шчыра вітала слаўнага на ўвесь свет музычнага дзеяча. Былі ў зале і беларусы з Латвіі, прыехалі таксама і з Вільні. Яны загадзя запрашалі кампазітара да сябе, каб прывітаць яго ў сваёй беларускай грамадзе ў Рызе, але мясцовая ўлада гэтага не дазволіла. Тады беларусы без запрашэння з’явіліся на вечарыну і там публічна прыпаднеслі кампазітару букет кветак і прыгожа аздоблены беларускім арнаментам прывітальны адрас з аўтографамі рыжскіх беларусаў. Арнамент намаляваў беларускі мастак Пётра Мірановіч.

Сярод выкананых твораў Аляксандра Грачанінава ў Рызе была і беларуская песня „Зязюлька”. Яна ў зале, як пісаў часопіс „Калоссе” (1937, № 1. С.62), „сабрала найбольш воплескаў”.

Дзякуючы дырэктару Варшаўскага радыё Эдмунду Рудніцкаму, наш слынны спявак Міхась Забэйда-Суміцкі ў 1938 годзе ўпершыню наспяваў на грамафонныя кружэлкі дзесяць беларускіх песень. Сярод іх былі чатыры песні Аляксандра Грачанінава: „Ляціць сарока”, „Конь бяжыць”, „Ой, рана куры запелі” (калядная), ды „Шчукарыба ў моры” (рэкруцкая). І, нагогул, у 1930-1940-х гадах у Заходняй Беларусі ніводзін беларускі канцэрт ці вечарына не праходзілі, каб у праграме не стаялі музычныя творы Аляксандра Грачанінава. А любоў да беларускай песні, да беларускай народнай творчасці прывіў яму ў пачатку XX стагоддзя прафесар-беларус Мікалай Янчук (1859-1921).


**Аляксандр Грачанінаў**

Справа ў тым, што пры Маскоўскім універсітэце ў 1903 годзе была заснавана музычная секцыя этнаграфічнага таварыства. Старшынёй секцыі быў выбраны прафесар Мікалай Янчук, які ў той час працаваў сакратаром аддзела этнаграфіі Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце. А віцэ-старшынёй пры ім быў абраны Аляксандр Грачанінаў. І вось на працягу шмат гадоў гэтай секцыяй было сабрана некалькі тамоў народнай музычнай творчасці, у тым ліку, натуральна, і беларускай. „Працуючы ў гэтай камісіі, – піша ў сваёй кнізе „Моя музыкальная жизнь” (Парыж, 1934) Аляксандр Грачанінаў, – я меў магчымасць пазнаць песні ўсіх народаў Расіі, з якіх асабліва палюбіў беларускія”. Далей вялікі кампазітар прыгадвае, як аднойчы Мікалай Янчук прынёс яму дзве беларускія песні „Гэй ты, доля” і „Бяда” з тым разлікам, калі спадабаюцца, каб апрацаваў. Песні Аляксандру Грачанінаву вельмі спадабаліся. Ён напісаў іх для спеву

і фартэпіяна і надрукаваў. Калі кампазітар прынёс іх Янчуку, прайграў і перадаў яму ноты ў падарунак, ён неяк хітра глянуў на яго, падзякаваў і сказаў „Надта добра, толькі мелодыі і тэкст гэтых песень не народныя, а мае”. Грачанінаў здзівіўся, бо так добра было падроблена на народны лад. І, вядома ж, у наступным выданні песні Аляксандра Грачанінава „Доля” і „Бяда” мелі аўтара. Вось адкуль пачалося знаёмства рускага кампазітара з беларускімі песнямі.

Нарадзіўся Аляксандр Грачанінаў у 1864 годзе ў Калузе, але хутка сям’я пераехала ў Маскву, дзе і прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады будучага кампазітара. Бацькі яго мелі музычныя здольнасці ад прыроды. Маці спявала не народныя песні, а сентыментальныя мяшчанскія рамансы, а бацька любіў спяваць царкоўныя песні.

У 1890 годзе Аляксандр Грачанінаў скончыў педагагічныя курсы Маскоўскай кансерваторыі па класу Васіля Сафронава і пераехаў у Пецярбург, дзе паступіў у кансерваторыю да педагога Рымскага-Корсакава. Пасля кансерваторыі зноў вярнуўся ў Маскву, дзе выкладаў у музычнай школе сясцёр Гнесіных.

Пасля рэвалюцыі 1917 года ў Расіі Аляксандр Грачанінаў некалькі гадоў канцэрціраваў у якасці дырыжора і піяніста, а таксама працягваў працу з дзіцячымі харамі. Але з кожным годам старэйшаму рускаму кампазітару станавілася жыць цяжэй і цяжэй у краіне, разбуранай рэвалюцыяй і грамадзянскай вайной.

У 1925 годзе ён з сям’ёй эмігрыруе ў Еўропу. Спачатку жыў у Парыжы, а потым пераехаў у Нью-Йорк. У 1934 годзе ён напісаў і выдаў кнігу ўспамінаў „Маё музычнае жыццё”, а праз 20 гадоў кніга на англійскай мове пабачыла свет і ў Нью-Йорку.

Да апошніх дзён Аляксандр Грачанінаў марыў вярнуцца на Радзіму, але гэта яму ажыццявіць не




**Афіша канцэртнага хору Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні за 15 чэрвеня 1932 года. На ёй ёсць і прозвішча Грачанінава**

ўдалося. Апошнія гады жыцця ён дажываў адзін і памёр на чужбіне ва ўзросце 92 гадоў.

Творчая спадчына кампазітара Аляксандра Грачанінава даволі вялікая – гэта 1000 твораў, у тым ліку 6 опер, дзіцячы балет, 5 сімфоній, 9 вялікіх сімфанічных твораў, музыка да 7 спектакляў, 4 струнныя квартэты, шматлікія інструментальныя і вакальныя творы. Але самая каштоўная частка яго спадчыны – харавая музыка, рамансы, харавыя і фартэпіянныя творы для дзяцей і г.д.

У 1932 годзе Рыгор Шырма пачаў перапісвацца з Аляксандрам Грачанінавым, які жыў у Парыжы. Аднойчы ён паслаў яму 25 запісаў заходнебеларускіх народных песень з просьбай апрацаваць іх для хору. Аляксандр Грачанінаў іх апрацаваў і даслаў Рыгору Шырму ў Вільню. На канцэртных выступленнях, якія шмат разоў ладзіліся ў Вільні, гарманізацыі Аляксандра Грачанінава так рэльефна выступалі сярод іншых, стваралі такія асаблівыя настроі, што публіка, не толькі беларуская, заўсёды звярталася з просьбай паўтарыць альбо прасіла проста перапісаць іх. Прастата, яснасць, прыгожая гучнасць без непатрэбных, чужых народу бравурных эфектаў, строга захаваны народны лада-танальны каларыт, дужа цікавы і не аднастайны спосаб гарманізацыі – вось асаблівасці тых апрацовак, якія так значна адрозніваліся ад іншых. «Перапёлка», «Раёк», «Перад Пятром», «Калыханка», «Вяснянка» – гэта былі і засталіся такія цудоўныя беларускія абразкі, што іх спявалі ў іншых краінах Еўропы, а „Перапёлачка” даляцела аж да Амерыкі. „Уклад, зроблены Грачанінавым у гісторыю развіцця беларускай песні, – піша Рыгор Шырма ў сваёй кнізе „Песня – душа народа” (Мн., 1976. С.40), – уяўляецца так. Для мяшанага хору апрацаваны: „Перапёлачка”, „Раёк”, „Перад Пятром”, „Чаму селязень”, „Ляцела зязюля”, „Не кур, не вей, мяцеліца”, „Ішла каляда”, „Ой, куры, куры”, „Ці ў полі не каліна была”, „Памру, памру, маці” і „Конь бяжыць, зямля дрыжыць”. Апрача таго, напісаны для аднаго голасу з акампанементам раяля: „Зазвінела пчолачка”, „Доля”, „Бяда”, „Вяснянка”, „Купалінка”, „Калыханка”, „Зязюля” і адна скрыпкавая п’еса на тэму калядкі з Пружанскага павета. Чатыры апошнія песні напісаны таксама для голасу з акампанементам аркестра і перакладзены на англійскую мову. У гэтых песнях народная мелодыя захавана для голасу без змен, а ўжо акампанементам Грачанінаў малюе свае беспадобныя музычныя ўзоры. Такое тонкае мастацтва, напрыклад, у перадачы настрояў маладой беларускай кабеты, якая спявае: „Дубравачка, ой зялёная, у тваім шуме я заблудзіла”, што, здаецца, кампазітар, паслухаўшы, пераклаў на музыку свайго акампанементу адвечны шум нашай Белавежы. Безумоўна, гэтыя творы трэба прызнаць шэдэўрамі ў беларускай народнай музычнай літаратуры”.

Вядома ж, усё пералічанае Рыгорам Шырмам далёка не поўны спіс таго, што з беларускіх песень апрацавана Аляксандрам Грачанінавым для хору і сола. Але рускі кампазітар паказаў усяму свету, што беларуская народная творчасць не толькі не ўступае творчасці іншых

народаў, а, наадварот, часта пераўзыходзіць іх.

Пра беларускасць Аляксандра Грачанінава ў 1930-х гадах пісалі многія заходнебеларускія выданні. Часопіс „Калоссе” ( 1937, № 1) паведамляў пра канцэрт беларускага спевака Міхася Забэйды-Суміцкага ў Вільні, што „гэты высокай клясы еўрапейскі артыст-чарадзей пры акампаніяменце прафесара Галкоўскага выканаў папулярнаапрацаваныя А. Грачанінавым чатыры беларускія народныя песні: „Ляціць сарока”, „Конь бяжыць”, „Шчука-рыба ў моры” і „Ой, рана куры запелі”.

На афішах і ў праграмках беларускіх вечароў і канцэртаў у Вільні таксама заўсёды стаяла імя Грачанінава. У праграме вечара беларускай паэзіі і песні, які ладзіўся 15 сакавіка 1936 года Беларускім студэнцкім саюзам, спевакі Л. Сасноўская і С. Савіцкі выконвалі песні Аляксандра Грачанінава „Ляціць сарока, ды скрай аблока”, Конь бяжыць”, „Шчука-рыба ў моры”, „Ой, рана куры запелі”, „Ой, ты грушка мая”. Рыгор Шырма дасылаў у Парыж народныя беларускія песні, а Аляксандр Ціханавіч Грачанінаў іх апрацоўваў і дасылаў у Вільню Рыгору Раманавічу, дасылаў адна за адной: „На дварэ дождждык”, „Ой, гыля, гыля, гусі, вадою”, „Зялёны гай”, „Там, каля млына” і многія-многія іншыя.

Аляксандр Грачанінаў напісаў цудоўную „Беларускую рапсодыю” для сімфанічнага аркестра і п’есу для скрыпкі і фартэпіяна „Дар Белай Русі”. А ў 1925 годзе Беларускай драматычнай студыяй у Маскве, а ў 1926 годзе Беларускім драматычным тэатрам-2 была пастаўлена казка-феерыя „Апраметная”. Яе напісаў беларускі драматург Васіль Шашалевіч, у якой сатырычнымі сродкамі паказаў гістарычны лёс Беларусі. Музыку да гэтай п’есы напісаў усё той жа Аляксандр Грачанінаў.

Многія беларусы ў 20-х – 40-х гадах XX стагоддзя не верылі, што Аляксандр Грачанінаў рускі па нацыянальнасці, яны думалі, што гэта беларус, які так добра ведаў беларускую песню, так глыбока вывучаў у ёй народную душу. Таму і мы сёння не павінны яго забываць.

**Сяргей Чыгрын**

**Песні Аляксандра Грачанінава друкавалі многія часопісы Заходняй Беларусі**

# *Успаміны з 1985 г.*

***1.*** Ад 2 студзеня я пачаў праектаваць у „Энергапраекце” фрагменты аўтаматыкі для атамнай электрастанцыі ў Жарноўцу, хаця часта ездзіў з іншымі праекціроўшчыкамі аўтамашынай „Энергапраекта” на аўтарскі нагляд ў электрастанцыю Белхатаў, дзе будаваліся ўжо шосты і сёмы блокі па 380 мегаватаў кожны.

7 студзеня Японія выпусціла ў космас першы міжпланетны зонд „Сакігакэ” (у перакладзе „Піянер”) выкананы ў ЗША з японскімі апаратамі ўнутры для вывучэння космасу. Сігналы ад яго даходзілі на Зямлю да 15 лістапада 1995 г.

11 студзеня савецкі касмічны зонд „Вега1” праляцеў ля планеты Венеры, выслаў здымкі і паляцеў у кірунку каметы Галея.

13 студзеня ў чыгуначнай катастрофе ў Эфіопіі згінула 428 асоб.

17 студзеня адкрылі помнік у Варшаве салдатам-касцюшкоўцам.

20 студзеня Рональд Рэйган стаў прэзідэнтам ЗША на наступныя 4 гады.

21 студзеня польскія альпіністы Анджэй Чок і Ежы Кукучка першы раз зімой ўвайшлі на вяршыню Дхаулагіры ў Гімалаях (8167 м).

24 студзеня наступіў 15 старт (STS-51C) амерыканскага Спейс Шатла і трэці палёт шатла «Дыскаверы» з касманаўтамі Томасам Матынглі, Ларэнам Шрайверам, Элісонам Анідзука, Джэймсам Бэчлі і Гэры Пейтанам. Былі ў космасе 3 суткі і 1 гадзіну.

1 лютага Грэнладыя выйшла з еўрапейскіх гаспадарчых арганізацый. 1лютага ў катастрофе савецкага самалёта Ту-134 ў Мінску згінула 58 асоб.

7 лютага суд прыгаварыў забойцаў ксяндза Ежы Папялушкі на 25 год турмы і на 10 год пазбавіў іх грамадзянскіх правоў.

8 лютага на Паўночным Моры затануў польскі карабель „Буска-Здруй". Згінула 24 асобы, адну асобу выратавалі.

8 лютага ад выбуху метана і вугальнага пылу ў шахце каменняга вугля „Ніўка-Маджэюў" у Сасноўцу згінула 5 шахцёраў.

12 лютага польскія альпіністы Мацей Бербека і Мацей Паўлікоўскі ўвайшлі першы раз зімой на вяршыню Чо Ою в Гімалаях (8201 м.)

13 лютага ў Гданьску арыштавалі дзеячоў „Салідарнасці" Уладзіслава Фрасынюка, Багдага Ліса і Адама Міхніка.

19 лютага ля Більбао ўдарыў у тэлевізійную вежу іспанскі самалёт Боінг 727 лініі Іберыя. Згінула 148 асоб і ў катастрофе малійскага самалёта Ан-24 у горадзе Тымбукту згінула 50 асоб.

25 лютага выдалілі з Польшы амерыканскага вайсковага аташэ, які з жонкай фатаграфаваў вайсковыя аб'екты. ЗША ўзамен выдалілі з Вашынгтона польскага палкоўніка З. Шыманскага.

28 лютага ірландскія баевікі IPA абстралялі мінамётам англійскі паліцэйскі ўчастак у Ньюры і забілі 9 афіцэраў паліцыі.

3 сакавіка ад землятрусу ў чылійскім раёне Вальпараіса згінула 177 асоб, а 2500 было параненых.

4 сакавіка ўлады ў Польшчы ўводзяць этапамі павышэнне цэн, незалежна ад супрацыву прафсаюза OPZZ.

9 сакавіка пажар у Варшаве знішчыў будынак Нацыянальнага тэатра.

10 сакавіка памер у Маскве Генеральны сакратар КПСС К. Чарненка (1911-1985).

11 сакавіка пленум ЦК КПСС выбраў Генеральным сакратаром ЦК КПСС Міхаіла Гарбачова.

12 сакавіка пачалося аднаўленне савецка-амерыканскіх мірных перамоў у Жэневе.

14 сакавіка прыехала ў „Энергапраект" на тыдзень група праекціроўшчыкаў з Ленінграда, якія там праектавалі атамны рэактар для электрастанцыі Жарновец. Трэба было хадзіць на сустрэчы з імі і на розныя тэхнічныя ўзгадненні.

1 красавіка на аэрадроме ў Варшаве сустрэў я польскую экскурсію „Орбіса", якая прыехала з Замосця, прывітаўся я з ёй, праверыў прысутных і разам з імі савецкім самалётам паляцелі мы ў Кіеў, дзе пасля праверкі дакументаў і прасветлення мытнікамі нашых багажоў, паляцелі мы дадей другім самалётам у Алер. У Адлеры сустрэла нас дзяўчынаэкскурсавод, якая ведала добра польскую мову і яна аўтобусам „Інтуриста" завезла нас ў Сочы ў прыгожую і вялікую 19 – павярховую гасцініцу „Жамчужыну", якая мае 956 пакояў з відам на мора. Раздзяліў я турыстам пакоі, з'елі мы там абед і паехалі аўтобусам „Інтуриста" з экскурсаводам аглядаць горад Сочы. Вярнуліся пад вечар на вячэру і на начлег.

2 красавіка пасля снедання паехалі мы з экскурсаводам спачатку у Музей гісторыі горада Сочы, а потым у Парк Рыв'ера, дзе паказалі нам розныя паўднёвыя расліны і дрэвы.

Пасля абеду далі нам час вольны. Пад гасцініцай можна было купацца ў басейне ў падаграванай марской вадзе, трэба было толькі паказаць лекару голыя ногі. У моры тады вада была хаподная. Можна было шпацыраваць ля мора ці ў горадзе.

3 красавіка пасля снедання паехалі мы на гару Ахун (700 м) і з вежы аглядалі панараму Сочы. Пасля абеда мелі мы вольны час.

4 красавіка пасля снедання завезлі нас на чыгуначны вакзал у Сочы і цягніком паехалі мы ў Краснадар, дзе на вакзале сустрэла нас другая дзяўчына-экскурсавод, якая ведала добра польскую мову і завезла нас у гасцініцу „Інтурыст", дзе дасталі мы пакоі і абед. Пасля абеда аб'ехалі мы аўтобусам горад і аглядзелі цікавыя помнікі, будынкі і месцы ў Краснадары.

5 красавіка пасля снедання завезлі нас у прадпрыемства на дэгустацыю паўднёвых савецкіх він і каньякоў. Нейкія турысты пасля ў аўтобусе спявалі вясёлыя песні.

6 красавіка пасля снедання паказалі нам Музей Каваленкі з карцінамі Шагала і іншых мастакоў, а пасля абеда Археалагічны музей са старымі манетамі, старой зброяй. Пасля завезлі нас на аэрадром і мы самалётам пад вечар прыляцелі ў Маскву. Там маскоўская дзяўчынаэкскурсавод завезла нас у гасцініцу „Інтурыст", дзе атрымалі мы пакоі, вячэру і начлег.

7 і 8 красавіка правялі мы ў Маскве і, як заўсёды, аглядзелі Маўзалей Леніна, Крэмль і Трэцьякоўскую галерэю. 8 сакавіка вечарам прывезлі нас на Беларускі чыгуначны вакзал і спальным вагонам ранкам 10 красавіка вярнуліся мы ў Варшаву. На вакзале я развітаўшыся з экскурсіяй, вярнуўся дамоў. 11 сакавіка я быў на працы, а 15 сакавіка ноччу спальным вагонам паехаў у санаторый ў Свінавусці.

1 красавіка, калі быў я на экскурсіі, улады ў Польшчы павысілі цэны на электраэнергію, газ і вугаль, а 12 красавіка зарэгістравалі Агульнапольскае пагадненне прафсаюзаў (OPZZ).

Ад пачатку 1985 года пачала балець у мяне правая нага. Рэнтген выказаў, што на пятах маёй пра-

вай і левай нагі нараслі так званыя „шпоры” і на правай назе націскала „шпора” мне на нейкі нерв і нага балела. У Варшаве награвалі мне пяты электратокам, ды гэта мне не памагала. Электраток не мог разбіць мне „шпораў” на пятах. І лекар «Энергапраекта» скіраваў мяне ў санаторый. Прызналі мне санаторый у Свінавусці ў Доме адпачынку Электрастанцыі Конін. Ад лістапада да мая кожнага года ў Свінавусці дамы адпачынку розных прадпрыемстваў замянялі ў санаторыі і лячылі людзей. Санаторыі былі бясплатнымі і час знаходжання ў санаторыі не ўлічваўся да адпачынковага водпуску. Раней высылалі ў санаторыі на тры тыдні, ды ў 1985 годзе скарацілі пабыўкі да 14 дзён. І мне прызналі санаторый з 16-га да 29-га сакавіка.

16 красавіка ранкам даехаў я цягніком да Свінавусця, пераехаў паромам заліў і ў Доме адпачынку Электрастанцыі Конін атрымаў я месца ў пакоі з ванным пакоем з адным інжынерам з Познані. Перад прыездам у санаторый мяне правеяў вецер і я стаў чуць боль у ягадзіцы, таму меў я там гразевыя ванны, а „шпоры” на пятах разбілі мне ўльтракароткімі хвалямі і правая нага і ягадзіца перасталі мне балець. У Свінавусці ў моры ў красавіку вада была халодная, нельга было купацца. Хадзіў я толькі на шпацыр па беразе мора. 30 красавіка ранкам вярнуўся я спальным вагонам цягніком дамоў у Варшаву і пайшоў на працу.

11 красавіка ў Албаніі пасля смерці Энвера Ходжа, выбралі першым сакратаром Албанскай партыі працы Раміза Алію.

12 красавіка ў ЗША наступіў 16 старт (STS-51D) па праграме Спейс Шатл і 4-ы палёт шатла „Дыскаверы” з касманаўтамі Каролем Бабко, Доналдам Уільямсам, Рэам Седонам, Давідам Грыге, Джэфры Хофманам,Чарлзам Уокерам і Эдвінам Гарнам. Былі яны ў космасе 6 сутак і 23 гадзіны.

19 красавіка ў СССР правялі падземны атамны выбух на Семіпалацінскім палігоне.

22 красавіка Вышэйшы суд ў Варшаве падтрымаў ранейшы прыгавор на забойцаў ксяндза Ежы Папялушкі.

26 красавіка ў Варшаве кіраўнікі сацыялістычных дзяржаў прадоўжылі Варшаўскі дагавор на наступныя 20 год.

29 красавіка польскі сейм прыняў рашэнне аб утварэнні Кастытуцыйнага Трыбунала.

29 красавіка ў ЗША наступіў семнаццаты старт (STS-51B) па праграме Спейс Шатл і сёмы палёт шатла „Чэленджэра” з касманаўтамі Робертам Авермаерам, Фрэдрыкам Грэгорым, Донам Ліндам, Норманам Тагардам, Уільямам Тарнтонам, Людвігам ван дэн Бергам і Тэйларам Уэнгам. Былі яны ў космасе 7 сутак.

30 красавіка Рада Міністраў Польшчы перадала маёмасць усіх „былых прафсаюзаў” Агульнапольскаму пагадненню прафсаюзаў (OPZZ).

1 мая ў час першамайскай дэманстрацыі ў Гданьску дайшло да сутыкнення 10 тысяч прыхільнікаў „Салідарнасці” з міліцыяй.

9 мая польская дэлегацыя з віцэміністрам абароны ген. Тадэвушам Тучапскім брала ўдзел у святкаванні 40 гадавіны перамогі ў Вялікай айчыннай вайне на Чырвоным пляцы ў Маскве.

10 мая сікхскія экстрэмісты зрабілі выбухі бомб у трох індыйскіх гарадах. Згінула 84 асобы.

11 мая ў пажары драўляных трыбун на футбольным стадыёне ў Брандфордзе ў Англіі згінула 56 асоб, а больш чым 300 асоб было параненых.

13 мая ў Філадэльфіі паліцэйскі верталёт скінуў бомбу на штабкватэру радыкальнай арганізацыі MOVE. У пажары згінула 11 асоб.

14 мая тамільскія баявікі напалі на горад Анурадхапуру ў Шры-Ланцы. Згінула 146 асоб.

16 мая выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнай рады СССР „Аб узмацненні барацьбы з п’янствам”, які даў пачатак антыалкагольнай кампаніі ў СССР, якая працягвалася да 1988 г.

22 мая ў Бейруце ад выбуху аўтамашыны-пасткі гіне 55 асоб.

25 мая ад трапічнага цыклона і штурмавой хвалі ў Бангладэшы гіне больш як 10 тысяч людзей.

28 мая прыехаў у Польшчу з візітам італьянскі прэм’ер Беціна Краксі.

29 мая на футбольным стадыёне ў Брюселе ў час фінальнана матча Кубка Чэмпіёнаў між камандамі Ліверпуля і Ювентуса ад бойкі між балельшчыкамі згінула 39 балельшчыкаў.

3 чэрвеня сустрэў я ў гасцініцы „Меркуры – Унія” ў Любліне савецкую экскурсію з Сібіры з Чыты, якая прыехала сваім аўтобусам „Саўтранства”. Раздзеліў я ім пакоі. Пасля абеду ў гасцініцы паехалі мы да вячэры іх аўтобусам з польскай дзяўчынай- экскурсаводам, якая добра ведала рускую мову, у горад і аглядзелі стары і новы Люблін. На наступны дзень пасля снедання паехалі мы з экскурсаводам і аглядзелі нямецкі лагер смерці Майданак і вярнуліся на абед у гасцініцу. Пасля абеда паехалі мы ў Кракаў, прыехалі вечарам у гасцініцу „Гранд”, дзе атрымалі пакоі на начлег і вячэру. 5 чэрвеня аглядзелі мы да абеда з мясцовым экскурсаводам, ведаўшым польскую мову, Вавель і горад, а пасля абеда Карцінную галерэю.

6 чэрвеня паехалі мы ў Асвенцім, дзе хадзілі пяшком па тэрыторыі лагера смерці і аглядалі сляды нямецкіх зверстваў. Пасля паказалі нам савецкі фільм аб вызваленні лагера Чырвонай арміяй. Пасля завезлі нас у горад у рэстаран на абед і паехалі мы ва Вроцлаў у гасцініцу „Манаполь”. Там атрымалі мы пакоі і вячэру. 7 чэрвеня ва Уроцлаве з мясцовым экскурсаводам аб’ехалді і аглядзелі горад, яго касцёлы і па-

сля абеда экскурсія паехала ў ГДР, а я цягніком у Варшаву дамоў.

З 1 чэрвеня ў СССР першы сакратар КПСС М. Габачоў пачаў уводзіць рэформы ў дзяржаве, якія назвалі „перабудовай” – па-руску „перестройкой”. Першы этап рэформы працягваўся да студзеня 1987 г. Пачалі барацьбу з непрацоўнымі даходамі і карупцыяй.

6 чэрвеня ў СССР выляцеў у космас касмічны карабель Саюз Т-13 з касманаўтамі У. Джэнібекавым і В. Савіных. Прыстыкаваліся яны да касмічнай станцыі Салют-7 і 2 жніўня выйшлі на 5 гадзін у адкрыты космас. Уладзімір Джэнібекаў быў у космасе 110 дзён і вярнуўся на Зямлю на Саюзе Т-13 26 верасня, а Віктар Савіных – 168 дзён і вярнуўся на Зямлю на Саюзе Т-14 21 лістапада.

14 чэрвеня па паразуменні Шэнген зліквідавалі візы між Францыяй і ФРГ.

14 чэрвеня ваяводскі суд у Гданьску прысудзіў Уладзіслава Фрасынюка, Багдана Ліса і Адама Міхніка ад 2,5 да 3,5гадоў турмы за дзейнасць у нелегальнай Нацыянальнай камісіі прафсаюзаў „Салідарнасць”.

17 чэрвеня ў ЗША наступіў 18 старт (STS-51G) па праграме Спейс Шатл. Пачаўся 5 палёт шатла „Дыскаверы” з касманаўтамі Дэніелам Брандэнстайнам, Джонам Крайтонам, Шэнонам Лусідам, Джонам Фабіянам, Стывенам Нейджэлам, французам Патрыкам Барды і касманаўтам з Саудаўскай Аравіі Салманам ас-Саулам. Закончыўся палёт 24 чэрвеня.

23 чэрвеня на поўдзень ад Ірландыі ў Атлантычным акіяне з вышыні 9500 м упаў пасажырскі самалёт Боінг-747 кампаніі Аір-Індыя. Згінула 329 асоб.

1 ліпеня ў Польшчы павысілі цэны мяса і вяндлін і павысілі таксама цэны скупкі мяса ад сялян. „Салідарнасць” заклікала да забастовак пратэста, аднак былі кароткія забастоўкі толькі на некалькіх фабрыках.

2 ліпеня Еўрапейскае Касмічнае Агенцтва выслала ў космас зонд Джыота (Giotto) да каметы Галея. Праляцеў зонд 596 км ад каметы і прыслаў на Зямлю здымкі яе ядра.

2 ліпеня ў СССР Андрэй Грамыка быў выбраны старшынёй Вярхоўнай рады СССР, а Эдуард Шэварнадзе, генеральны сакратар ЦК КП СССР, стаў міністрам замежных спраў СССР.

7 ліпеня разам з працаўнікамі „Энергапраекта” ездзіў я аўтамашынай на электрастанцыю Белхатаў на сінхранізацыю 6-га блока 380 мегаватаў. Гатовіўся ўжо сёмы блок.

**Дзмітры Шатыловіч**

*(Працяг будзе)*

*Васіль Петручук*

# *Крышынкі*

***64**. Białystok dnia 6.II.1996, Pan Jacek Kuroń, Poseł do Sejmu RP*. Panie Pośle, Pański kolega klubowy poseł Tadeusz Mazowiecki jako przedstawiciel ONZ wykazał się zadziwiającą odwagą. Nie tylko jeździł do b. Jugosławii w kamizelce kuloodpornej, lecz w raporcie swym stwierdził występowanie zdarzeń i aktów świadczących o dokonywaniu zbrodni przeciwko ludzkości przez wszystkie walczące ze sobą strony. Swoją odważną postawą zyskał szacunek i uznanie.

Dlaczego Pan, Panie Pośle, jako członek Sejmowej Komisji ds. Mniejszości nie może się ustosunkować do takich samych zbrodni, dokonanych w Polsce 50 lat temu z tych samych pobudek i motywów przez oddziały zbrojnego podziemia dowodzonego przez kpt. Romualda Rajsa ps. „Bury”, a podległe d-cy V Brygady mjr. Zygmuntowi Szendzielarzowi ps. „Łupaszko”.

Właśnie oddziały te w dniach 28.I – 3.II.1946 roku, działając na terenie Białostocczyzny, dokonały aktu ludobójstwa, pacyfikując wsie Zanie, Zaleszany, Szpaki, Wólka Wygonowska, Końcowizna i inne. Zabudowania tych wsi spalono, a ludność wymordowano, w tym dzieci, starców, kobiety, nawet w ciąży. Niektórych wrzucono żywcem do ognia. Dokonywano również gwałtów, rabunku mienia i czystek etnicznych i to wyłącznie w stosunku do ludności narodowości białoruskiej wyznania prawosławnego. Zdarzenia te, niczym nie różniące się od opisywanych wydarzeń w b. Jugosławii nie znalazły dotychczas właściwej oceny i naświetlenia, gdyż:

– najpierw była obawa przed zemstą zbrojnego podziemia, które groziło, że w każdej chwili może powtórzyć „rajd pożogi i śmierci”;

– następnie została zastosowana teoria nierozdrapywania zabliźnionych ran (dla „świętego spokoju”);

– gierkowska teoria moralno-politycznej jedności narodu również nie sprzyjała wyjaśnieniu i nazwaniu po imieniu tych zbrodni.

Doprowadziło to do tego, że dopiero w ostatnich latach zaczęto szukać grobów pomordowanych przez zbrojne podziemie AK-WiN i NSZ-NZW oraz na krzyżach umieszczać napisy o przyczynie tragicznej śmierci.

Dokonywane przez zbrojne podziemie akty ludobójstwa prawosławnych Białorusinów nie znajdują żadnego racjonalnego uzasadnienia. Nie wszyscy w zbrojnym podziemiu prowadzili walkę o niepodległość. Część ugrupowań AK-WiN i NSZ-NZW zastosowała niekonwencjonalne formy i metody walki o władzę – terror w stosun-

ku do niewinnej ludności. A to nie była walka o niepodległość. Walka o niepodległość nie wymaga tysięcy zamordowanych niewinnych osób, likwidacji całych rodzin fornali wyznania prawosławnego, korzystających z dworskiej ziemi (np. Buchwałowo, pow. Sokółka), pacyfikacji wsi, mieszkańców których mordowano, palono żywcem, gwałcono, rabowano ich mienie oraz przeprowadzania czystek etnicznych tylko za to, że ktoś był innej narodowości i wyznania czy też poglądów społeczno-politycznych. Jest to terroryzm (jeżeli nie nazwać tego zwykłym bandytyzmem). A dla akcji terrorystycznych nie ma żadnego usprawiedliwienia – nie mogą go stanowić nawet najbardziej szczytne cele, z walką o niepodległość włącznie. Dla przykładu, powstanie styczniowe 1863 roku było walką partyzancką. Walczono o niepodległość. Jednak na Białostocczyźnie powstańcy nie spacyfikowali żadnej wsi. A przecież nie wszędzie spotykali się z entuzjastycznym przyjęciem.

Niechęć wyjaśnienia do końca dokonywanych aktów ludobójstwa przez niektóre oddziały z ugrupowań AK-WiN i NSZ-NZW wywiera negatywny wpływ na polskie ustawodawstwo. M.in. w aktualnej ustawie o kombatantach występują zasadnicze mankamenty, niedopuszczalne w państwie prawa, a mianowicie:

– została naruszona konstytucyjna zasada równości obywateli wobec prawa;

– wprowadzono zasadę zbiorowej odpowiedzialności;

– dokonano nadinterpretacji „opozycji demokratycznej", do której trudno zaliczyć działające w latach 1944-48 organizacje zbrojnego podziemia AK-WiN i NSZ-NZW.

W białostockim środowisku kombatanckim od kilku lat budzi zaniepokojenie prowadzona weryfikacja członków Związku Kombatantów RP i Byłych Więźniów Politycznych. W szczególności dotyczy to tych członków, którzy uprawnienia kombatanckie uzyskali za działalność w utrwalaniu władzy ludowej lub też mają zaliczoną działalność z okresu wojny, po zakończeniu której zostali skierowani lub zgłosili się sami do organów bezpieczeństwa (MO, KBW, WOP, UB, ORMO, Więziennictwo), ewentualnie jednostek WP biorących udział w zaprowadzaniu ładu, porządku i bezpieczeństwa. Służyli oni realnej Polsce, jaka istniała i była międzynarodowo uznaną. Niektórzy bronili swoich domów i wsi, aby nie dopuścić do pacyfikacji. Działalność w powołanych prawnie zmilitaryzowanych służbach państwowych i organizacjach prowadzili w oparciu o ustawodawstwo ustanowione w II Rzeczypospolitej, któremu również sami podlegali. Za łamanie praworządności ponosili odpowiedzialność nie tylko dyscyplinarną, ale również karno-sądową. Świadczą o tym akta znajdujące się w archiwach sądów i MSW. Pozbawienie uprawnień kombatanckich tej kategorii członków jest zastosowaniem zasady zbiorowej odpowiedzialności. Tym bardziej jest to zadziwiające, że dotyczy tylko jednej strony uczestniczącej w wojnie domowej, tj. tylko tych, którzy z nakazu prawowitego rządu (a takim był Rząd Jedności Narodowej, wicepremierem którego był Stanisław Mikołajozyk), zgodnie z obowiązującymi aktami prawnymi zapewniali ład, porządek i bezpieczeństwo, a przez to warunki do odbudowy zrujnowanego przez wojnę i okupację kraju.

Niestety, nie można tego powiedzieć o drugiej stronie konfliktu, tj. o zbrojnym podziemiu AK-WiN i NSZ-NZW. Trudno znaleźć w archiwach krajowych i zagranicznych jakikolwiek ślad ukarania przez władze podziemia swoich podkomendnych – sprawców potwornych zbrodni (na Białostocczyźnie szczególnym okrucieństwem wyróżnili się m.in. Zygmunt Szendzielarz ps. „Łupaszko", kpt. Romuald Rajs ps. „Bury" i Z. B. ps. "Zygmunt"). Odwrotnie, byli oni wyróżniani, a obecnie w stosunku do nich zastosowano „zasadę zbiorowego darowania winy" i oficjalnie zostali uznani za bohaterów narodowych. A przecież wydawali oni wyroki śmierci na całe wsie, rodziny i grupy osób wbrew obowiązującym przepisom prawnym, bez zastosowania procedury udowodnienia winy zgodnie z prawem, kierując się najniższymi instynktami wynikającymi w wielu przypadkach ze skrajnego nacjonalizmu, szowinizmu, antysemityzmu, czy zwyrodnienia psychicznego. Została więc naruszona konstytucyjna zasada równości obywateli wobec prawa. A w państwie prawa tylko popełnione karalne czyny i stopień ich szkodliwości winne być brane pod uwagę bez względu na to, kto je popełnił. Nie można też stosować zbiorowej odpowiedzialności tak w stosunku do jednej, jak i do drugiej strony.

